АСОБЫ І ІХ АДМЕТНЫЯ РОЛІ 5

КАБ МЕЦЬ, ТРЭБА ЎМЕЦЬ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+ТВ ПРАГРАМА

24 ЧЭРВЕНЯ 2022 г. ПЯТНІЦА № 122 (29744)

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ, дзяржсакратар Савета Бяспекі:

«Трансфармацыя злачынных праяў, перш за ўсё з улікам развіцця інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, з'яўленне новых відаў і спосабаў учынення кіберзлачынстваў, рост крымінальна караных дзеянняў экстрэмісцкай накіраванасці, у тым ліку якія кіруюцца і фінансуюцца з-за мяжы, нарастанне міграцыйнага крызісу абумоўліваюць неабходнасць пошуку найбольш аптымальных форм супрацьдзеяння названым і іншым супрацьпраўным дзеянням».

КАРАТКА

- **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка знаходзіцца з візітам у Расіі, чакаецца вялікая праграма зносін з Уладзімірам Пуціным. Рабочая сустрэча лідараў пройдзе 25 чэрвеня ў Санкт-Пецярбургу.**
- У Беларусі паставілі на паток унікальную аперацыю — каранаграфію аднаго дня.
- **Фрагмент посуду ўзростам каля пяці тысяч гадоў знайшлі археолагі ў Лепельскім раёне.**
- У Беларусі штогод каля 60—80 дзяцей становяцца інвалідамі ў выніку траўм і пашкоджанняў.
- **Унікальную шматтомную энцыклапедыю «Гарады і вёскі Беларусі» падрыхтавалі ў НАН.**
- Беларусбанк увёў абмежаванне на зняцце наяўных з картак банкаўнерэзідэнтаў.
- **Стартаваў прыём заявак на фестываль творчасці «Агонь маладзёжных талентаў».**

КАЛЯ ВЯСКОВАЙ СВЯТЫНІ

Іван САПАЧ жыве ў Рэдзьках Маладзечанскага раёна і з таго часу, як дэмабілізаваўся з арміі, працуе на вясковай ферме — даглядчыкам першацёлак. Яшчэ са школы Іван Іванавіч выбраў сабе гэтую нялёгкую, але клапатлівую і адказную працу жывёлавода. Доўгі час працаваў побач са сваім бацькам. Цяпер на ферме Івану дапамагае яго незаменны сябар — жарабец Гоша. Вяскоўцы часта бачаць жывёлавода разам з яго рахманым памочнікам, бо кожную раніцу яны праходзяць пад вокнамі, варотамі і веснічкамі сваіх суседзяў. Не адно дзесяцігоддзе побач з падворкам Івана стаіць крыж, які пастаўлены папярэднімі пакаленнямі духоўна аберагаць населены пункт. Вясковая святыня быццам бы штовечар сустракае Івана Сапача пасля працы з фермы ці поля.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Нестандартная педагогіка

ВЕЛАПАДАРОЖЖА ДА МАРЫ

У Гомельскім раёне незвычайны падыход дапамог падтрымаць «цяжкага падлетка»

Старшыня і намеснік старшыні камісіі па справах непаўналетніх Гомельскага райвыканкама Ігар БЕЙЗЕРАЎ і Кацярына ВАЎЧОК разам з педагогам Аздзелінскага дзіцячага сада — базавай школы ўручылі веласіпед вучню.

Чатырнаццацігадовы Вова з вёскі Аздзеліна, што за 16 кіламетраў ад Гомеля, дужа хацеў займець веласіпед. Аб новым нават не марыў. Нерэальна ў яго сямейнай сістэме каардынат. А здавацца не хацелася: са старых запчастак у гаражы спрабаваў сам сабраць свайго «велафранкенштэйна». Атрымлівалася. Не ведаў тады, што кола яго веласіпеднай гісторыі праз пару месяцаў раскруцяцца зусім ужо нечакана. У першыя дні школьных канікулаў падлетак прачнуўся знакамітым у сваёй вёсцы. Ды яшчэ і ўладальнікам новенькага жалезнага таварыша.

СТАР. 3

Будаўніцтва

ШМАТДЗЕТНЫМ СЕМ'ЯМ У МІНСКУ ПРАПАНУЮЦЬ УСЕ ВАРЫЯНТЫ: АД КАТЭДЖАЎ ДА САЦЫЯЛЬНАГА І АРЭНДНАГА ЖЫЛЛЯ

Цікава, як думаеце, у якім рэгіёне краіны больш за ўсё жадаюць прапісацца нашы суайчыннікі? Правільна, у сталіцы. Толькі ўсіх ахвотных ніяк не заселіш, няхай нават і ў буйны мегаполіс дзяржавы. Каб захаваць кампактнасць і гістарычную ідэнтычнасць Мінска, сталі рабіць стаўку на тое, што асноўная маса жыллёвага будаўніцтва паступова будзе пераходзіць у гарады-спадарожнікі. Спецыялісты лічаць, што такое ўзвядзенне жылля «на галёрцы» будзе зніжаць перанаселенасць сталіцы.

Абмежаванне кальцавой дарогай

Так, гэта факт, чарга на будаўніцтва жылля ў Мінску самая вялікая. Яна налічвае каля 185,5 тысячы сем'яў, што складае траціну ад агульнарэспубліканскай колькасці. З іх больш за пяць тысяч — шматдзетныя сям'і, у дачыненні да якіх заканадаўствам вызначаны гадавы тэрмін накіравання на паляпшэнне жыллёвых умоў. Больш за тры тысячы шматдзетных сем'яў ужо будуюцца, астатнія чакаюць сваёй чаргі, паведаміла **начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Мінскага гарвыканкама Алена ЛУКАШЭВІЧ.**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Парламенцкі дзённік

ПАЧАТАК ПАКЛАДЗЕНЫ. ПРАЦЯГ БУДЗЕ ВАРТЫ

Учора ў Савеце Рэспублікі прайшло заключнае пасяджэнне Маладзёжнага савета (парламента) першага склікання

«Нашы калегі, маладыя парламентарыі, актыўна ўключыліся ў работу, калі іх упершыню выбралі для работы ў Маладзёжным савеце. Гэта быў якраз ліпень 2020 года — вельмі гарачы час. Сёння на гэтай сесіі падводзяць вынікі. Я ўдзячная маладым парламентарыям за нашу сумесную працу. Яны прымалі ўдзел абсалютна ва ўсіх нашых мерапрыемствах. Мы ўсюды іх запрашалі — на пасяджэнні сесіі Савета Рэспублікі, выязныя прэзідыумы, прыёмы грамадзян па асабістых пытаннях, і яны заўсёды былі з намі. Для іх гэта была добрая школа, я ніколькі ў гэтым не сумняваюся», — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА, вітаючы ўдзельнікаў мерапрыемства.

Яна падкрэсліла, што і для сенатараў вельмі важнае супрацоўніцтва з гэтым складам. «Спадзяюся, што новы склад, які прыйдзе і будзе працаваць (магчыма, нехта з іх застанецца, але гэта ўжо на рашэнне Маладзёжнага савета і мясцовых органаў улады), працягне слаўную традыцыю, распачатую ў першым скліканні. Гэтыя два гады — вельмі няпросты перыяд у жыцці нашай краіны і наогул у свеце. Мы бачым, якія падзеі адбываюцца. Аднак маладыя парламентарыі з гонарам і годнасцю выконвалі ўсе функцыі, ускладзеныя на Маладзёжны савет. Я ім вельмі ўдзячная за гэта. Гэта добры кадравы патэнцыял для нашай краіны», — упэўнена спікер.

Як адзначыла спікер верхняй палаты, маладыя парламентарыі працавалі з моманту абрання ў 2020 годзе ў няпростых умовах: «Адбываецца геапалітычны падзел свету, часам здараюцца жудасныя падзеі, хлусня, фэйкі запаланяюць сусветную інфармацыйную прастору і нашай краіны ў тым ліку, і ў гэты час прыходзіце вы і пачынаеце працаваць разам з намі. Мы разумеем, што вы — будучыня ўсёй краіны, і вы павінны зрабіць усё, каб Беларусь была такой, якой з'яўляецца сёння, — мірнай, спакойнай, незалежнай, суверэннай».

Маладзёжны савет, упэўненая Наталля Качанава, — неацэнная магчымасць для маладых парламентарыяў атрымаць досвед, пагутарыць, выказаць меркаванне, рэалізаваць ідэі. Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла, што галоўная ацэнка работы Савета — вялікая цікавасць маладых людзей. «Калі я сустракалася з моладдзю, расказвала аб нашай дзейнасці, у мяне заўсёды пыталіся, як можна трапіць у Маладзёжны парламент. Гэта сведчыць: пра вас ведаюць, бачаць і цэняць, што вельмі важна, — канстатавала яна. — Кіраўнік дзяржавы заўсёды даваў высокую ацэнку таму, як вы працуеце. Таму пачатак вы паклалі вельмі добры. Важна, каб вашы напрацоўкі, традыцыі працягнулі тыя, хто прыйдзе заўтра».

Паводле слоў спікера, актыўных маладых людзей дзяржава працягне падтрымліваць у пачынаннях, бо яны складаюць кадравы рэзерв краіны.

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА:

«НОВЫ КОДЭКС АБ ЗЯМЛІ БУДЗЕ САДЗЕЙНІЧАЦЬ РАЗВІЦЦЮ СЕЛЬСКІХ ТЭРЫТОРЫЙ»

У Бялынічах абмеркавалі праект абноўленага Кодэкса аб зямлі і сучасныя падыходы вырашэння звязаных з зямлёй праблем

Нарада-семінар прайшла пад кіраўніцтвам Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзіміра АНДРЭЙЧАНКІ. Удзел узялі старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА, старшыня аблсавета Ірына РАІНЧЫК. Для абмеркавання зямельных пытанняў запрасілі кіраўнікоў раёнаў, старшынь сельскіх Саветаў, дэпутатаў, прадстаўнікоў сельгасарганізацый — усіх, каму гэтыя пытанні блізкія і хто добра ведае вузкія месцы.

Гаворка ішла пра тое, што наспела вострая неабходнасць карэкціроўкі зямельнага пытання. Работа над удасканаленнем кодэкса вялася і раней, у лютым Прэзідэнт паставіў задачу перад дэпутатамі паскорыцца і разгледзець яго больш комплексна і бездакладна. Законапраект быў прыняты ў першым чытанні ў сакавіку, зараз працягваецца яго дапрацоўка да другога чытання.

— Гістарычна так склалася, што зямельныя пытанні з'яўляюцца найважнейшымі, — адзначыў у размове з журналістамі Уладзімір Андрэйчанка. — Зроблена вялікая работа па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у існуючы закон, толькі пасяджэнняў рабочых груп праведзена 14. Новы кодэкс будзе садзейнічаць развіццю сельскіх тэрыторый, уцягванню ў абарот зямель, якія не выкарыстоўваюцца, зняццю шматлікіх бюракратычных працэдур, якія сёння маюць месца ў зямельных адносінах. І, безумоўна, значная частка паўнамоцтваў будзе перададзена зверху ўніз.

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па аграрнай палітыцы Мікалай ШАЎЧУК лічыць праект новага кодэкса прагрэсіўным.

— Яго мэта: каб на кожным кавалачку зямлі быў гаспадар, — адзначыў ён. — У практыцы нашай камісіі існуе правіла: дзеля прыняцця важных законаў мы заўсёды выязджаем на месца, у рэгіёны, каб зверыць канчатковыя пазіцыі, каб выключыць памылкі, улічыць нюансы, якія ёсць на месцах і з цэнтра не заўсёды бачныя. І гэта нарада не выключэнне.

Па дзеючым заканадаўстве выдзяленне дадатковага зямельнага ўчастка магчыма толькі пад рэканструкцыю асноўнага збудавання, то-бок дома, або праз аўкцыён, што не заўсёды зручна. Згодна з прапанаванымі новаўвядзеннямі, набыць такі ўчастак можна будзе без гэтых патрабаванняў.

Па новых нормах плошча зямельнага ўчастка будзе прапаноўвацца ў сельскіх населеных пунктах да 1 гектара. Для параўнання: сёння грамадзянам для пабудовы і абслугоўвання жылога дома выдзяляецца 25 сотак. Уступленне новага кодэкса ў сілу дазволіць ім паўней рэалізоўваць свае правы на выкарыстанне зямлі.

Дакладчыкі казалі пра тое, што новы кодэкс дапаможа навесці парадак ва ўсіх пытаннях, якія ўзнікалі ў сувязі з выдзяленнем участкаў. Прадпрыемствы і арганізацыі змогуць атрымаць дадатковыя ўчасткі пад сваё развіццё прасцей і хутчэй.

Начальнік Бялыніцкага ДЭУ № 74 Андрэй КОЛАСАЎ — адзін з тых, хто з нецярпеннем чакае ўвядзення новых норм кодэкса. Кажа, што раней, каб набыць зямлю, трэба было звяртацца на аўкцыён і праходзіць доўгатэрміновую працэдуру вырашэння пытання. Гэта магло расцягнуцца на гады, — цяпер, мяркуе, будзе нашмат хутчэй. Зямля прадпрыемству патрэбна для пашырэння базы і рэалізацыі новых высокатэхналагічных праектаў.

Новы кодэкс дасць таксама магчымасць без асаблівых складанасцяў разабрацца і з самавольным будаўніцтвам. Раней, каб захаваць пабудову, трэба было атрымаць дазвол Прэзідэнта. Цяпер гэта таксама вырашаецца на месцах. Наколькі пытанне актуальнае, сведчаць наступныя лічбы. У сваім дакладзе **начальнік галоўнага ўпраўлення землеўпарадкавання Магілёўскага аблвыканкама Ірына ПЕТРУЧЭНЯ** адзначыла, што на сёння ў Магілёўскай вобласці налічваецца 6,5 тысячы фактаў самавольнага будаўніцтва і незаконна занятых зямельных участкаў. І гэта пры тым, што інвентарызацыя праведзена пакуль толькі на 60 %.

— Новы кодэкс дазволіць на месцах вырашаць шматлікія праблемы, — падкрэсліў **старшыня Чавускага райсавета Анатоль МАЦЮЛІН.** — Напрыклад, прасцей можна будзе даць участак пад усталяванне прыпыначнага пункта. Раней даходзіла да смешнага. Каб пасунуць гэты пункт умоўна на два метры ў бок, трэба было ўзгадненне з Мінскам.

— На мой погляд, гэта мерапрыемства знакавае, — рэзюмавала **старшыня Магілёўскага аблсавета дэпутатаў Ірына РАІНЧЫК.** — Для нас, дэпутатаў базавага, пярвічнага, гарадскога, абласнога ўзроўняў, зямельнае пытанне вельмі важнае. Кодэкс распрацаваны з разуменнем тых зваротаў, якія паступаюць да дэпутацкага корпуса, выканаўчай улады. За кожнай зямельнай спрэчкай стаіць пэўны чалавек, якому трэба дапамагчы, растлумачыць і аказаць садзейнічанне. І вельмі важна, каб пытанні зямельнага характару вырашаліся на месцах.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

г. Бялынічы.

Медыяпрастора

АД ДРУКАВАНАГА СЛОВА ДА ВІДЭАКАНТЭНТУ

Што сёння цікава аўдыторыі розных узростаў і як прыцягваць увагу, якія новыя формы працы для гэтага патрабуюцца, абмеркавалі супрацоўнікі сродкаў масавай інфармацыі з усёй краіны. Цэнтрам беларускай журналістыкі ў чацвер стаў Віцебск. На базе Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Пятра Машэрава прайшоў II Форум медыйнай супольнасці Беларусі. У цэнтры ўвагі прадстаўнікоў Міністэрства інфармацыі, рэдактараў сродкаў масавай інфармацыі, журналістаў, блогераў — рэгіянальныя медыя ў лічбавай прасторы, вопыт, праблемы і перспектывы гэтага напрамку дзейнасці.

Фота БелТА.

Вітаючы ўдзельнікаў форуму, **міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ** падкрэсліў: «Пытанняў нямала. Першае — як пашыраць сваю аўдыторыю і нарошчваць прысутнасць дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі ў новых медыя. Гэта агульнае пытанне, якое я чую, наведваючы шматлікія рэдакцыі раённых СМІ. «Мы сутыкнуліся з агрэсіўнымі паводзінамі лічбавых платформ. Мы бачым, як яны мяняюць работу сваіх алгарытмаў. Але зараз маскі зняты, ідзе інфармацыйная вайна. Нашы апаненты, не саромеючыся, высякаюць нашы каналы, выказваюць тэлеграм-каналы. Але гэта рэаліі, з якімі мы мусім жыць. І на гэтыя пытанні мы пастараемся адказаць», — адзначыў Уладзімір Пярцоў.

Асобна міністр інфармацыі акцэнтаваў увагу на даручэнні, якое Прэзідэнт даў 10 чэрвеня на семінары-нарадзе па рабоце з насельніцтвам на мясцовым узроўні. Яно датычыцца ўдасканалення кантэнту рэгіянальных СМІ, у прыватнасці адлюстравання праблем рэгіёна. Па словах Уладзіміра Пярцова, усё, што хвалюе людзей, павінна вырашацца, а не толькі гіпертрафіравацца як няздольнасць улады вырашаць праблемы. Усе праблемы рэгіёна павінны абазначацца ў мясцовых медыя і вырашацца: «Тады вы будзеце эфектыўным каналам камунікацыі і карысныя для вашых чытачоў, гледачоў, слухачоў і органаў улады і для краіны ў цэлым».

Уладзімір Пярцоў нагадаў: ні для кога не сакрэт, што інфармацыйнае супрацьстаянне працягваецца. «Ад нас не адстануць, у нас напарадзе няпростыя гады, і мы мусім стаць сапраўднымі эфектыўнымі сродкамі масавай інфармацыі, запатрабаванымі ў чытачоў, гледачоў і слухачоў», — сказаў ён. «Калі вы будзеце ахопліваць большы аб'ём работ, рабіць больш кантэнту, эфектыўна яго прасоўваць у сацыяльных сетках, тады мы будзем адзінай магутнай інфармацыйнай машынай, якой і павінны быць, якой я бачу ўсю сістэму рэгіянальных СМІ і што ад нас патрабуе кіраўнік дзяржавы», — адзначыў Уладзімір Пярцоў.

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН звярнуўся да ўдзельнікаў форуму не як кіраўнік рэгіёна, а як чытач і глядач. «Сродкі масавай інфармацыі адыгрываюць важную ролю ў фарміраванні светапогляду жыхароў краіны і стараюцца задавальняць іх інфармацыйныя патрэбы. Вы прымушаеце дзейнічаць больш актыўна, інтэнсіўна і ў патрэбным напрамку выканаўчую ўладу. У нас ідзе вайна на інфармацыйным полі. Гэта непрыемнае слова, але няма ліха без дабра. Менавіта падзеі, якія пачаліся ў 2020 годзе, дазволілі ўзварушыць нашу інфармацыйную сферу. Навіны сталі цікавейшымі, агрэсіўнымі, надзённымі. З'явіліся новыя імёны, падыходы, людзі, перадачы», — сказаў ён.

Сваім вопытам работы ў лічбавай прасторы з калегамі падзяліліся прадстаўнікі СМІ, якія ўжо засвоілі правілы работы ў інтэрнэце. **Генеральны дырэктар інфармацыйнага агенцтва БелТА Ірына АКУЛОВІЧ** расказала, што апошнім часам агенцтва перабудавала сваю работу з улікам запытаў аўдыторыі. Гэта знайшло адлюстраванне ў новых праектах, акцэнце на мультымедыйны фармат. Паводле яе слоў, працуе над гэтымі матэрыяламі зусім невялікая каманда ад фотакараў да журналістаў прэзідэнцкага пула. «Мы разумеем, што, выкарыстоўваючы відэакантэнт, мы можам атрымаць нашмат большую аддачу. А ў сучасных умовах перанасычанага інфармацыяй медыярынку важна не проста валодаць кантэнтам, але і правільна яго прасоўваць», — растлумачыла Ірына Акуловіч.

Таксама эксперты абмеркавалі, як раёнкам працаваць у складзе медыяхолдынгаў, як даваць аўдыторыі важную інфармацыю і пры гэтым не нагружаць людзей. І самае галоўнае — заставацца цікавымі для сваёй аўдыторыі, расказваць пра дасягненні вобласці і краіны, дапамагаць людзям у рашэнні іх праблем.

Валерыя СЦЯЦКО, г. Віцебск.

Падчас медыяфоруму былі ўручаны ўзнагароды Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара». Гран-пры за найлепшы творчы праект года рэспубліканскіх друкаваных СМІ, інфармацыйных агенцтваў, сеткавых выданняў атрымаў праект «Тенденции» Выдавецкага дома «Беларусь сегодня».

Узнагарода «За ўклад у журналістыку» ўручана галоўнаму рэдактару газеты «Гомельская праўда» Сяргею Бяспаламу.

ВЕЛАПАДАРОЖЖА ДА МАРЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дарэчы, Вова — злосны прагульшчык. Быў! Менавіта пропускі васьмікласніка Аздзелінскага дзіцячага сада — базавай школы прымусілі педагогаў сур'ёзна ўзяцца за персону падлетка. Размаўлялі, высвятлялі, што здарылася: можа, з кім не склаліся адносіны, ёсць канфлікт? Настаўнікі і маці хлопца спрабавалі высветліць прычыны поўнай адсутнасці матывацыі да вучобы. Нягледзячы на тое, што вучань не здзейсніў ніякіх праступкаў у плане парушэнняў закона, дырэктар — педагог з 25-гадовым стажам Наталля Іванаўна Сычова — спрацавала на апярэджанне. Вырашыла падаць хадайніцтва аб разглядзе стаўлення да навучальнага працэсу і вучэбнай дысцыпліны васьмікласніка на пасяджэнні камісіі па справах непаўналетніх Гомельскага райвыканкама. Маці хлопчыка, якая адна выхоўвае Вову і дзвюх яго сястрычак, такую меру толькі падтрымала. На камісію паехалі ўтрох — дырэктар школы, маці Алена Аляксееўна і сам Уладзімір.

— Калі да нас паступае хадайніцтва на дзіця, мы збіраем інфармацыю аб ім, яго сям'і з сельвыканкамаў, медустаноў, калі неабходна, да разгляду справы на камісіі, каб усебакова і аб'ектыўна прааналізаваць матэрыял, — тлумачыць **намеснік старшыні камісіі па справах непаўналетніх Гомельскага райвыканкама Кацярына ВАЎЧОК.** — Нават калі на пасяджэнні камісіі вывучаюцца самыя негатыўныя моманты ў паводзінах дзіцяці, мы заўсёды ведаем, што ёсць і нешта добрае, пазітыўнае.

Там жа, на пасяджэнні камісіі, і выявілася: так, Вова з Аздзеліна школу прагульваў. Але не ў дрэнных кампаніях праводзіў час, не бадзяўся, не краў, а ішоў дадому ў гараж: чысціў запчасткі, каб урэшце паспець да вясны ўсё ж сабраць веласіпед. У тэхніцы, як аказалася, Вова — дока. Так, у школе вучэбныя справы не клеіліся, зусім з'ехаў на нізкія балы, проста рукі апускаліся, а тут у гаражы — тэхнічная сублімацыя.

Удзел у пасяджэнні камісіі, дзе разбіраюць справу твайго дзіцяці, — падзея вельмі эмацыянальна няпростая для бацькоў. Маці Вовы паводзіла сябе вельмі годна. Была ўдзячна, што ўдзельнікі камісіі па справах непаўналетніх імкнуцца дапамагчы, знайсці падыход да падлетка ў яго няпростым узросце. Алена Аляксееўна — сама работнік Аздзелінскага дзіцячага сада — базавай школы. Работнік па прыборцы тэрыторыі, яна вельмі рана ідзе на працу. Прызнавалася, што і сама, можа, нешта не дагледзела ў стаўленні сына да школы.

Тое, што ў рабоце з дзецьмі, якія прыцягнулі да сябе ўвагу органаў кантролю, нельга падыходзіць шаблонна, даказалі чарговы раз удзельнікі раённай камісіі па справах непаўналетніх. Цікавую прапанову хлопцу, каб той таксама ўявіў адказнасць за свае паводзіны, зрабіў старшыня камісіі па справах непаўналетніх, намеснік старшыні Гомельскага райвыканкама. Ігар Бейзераў узяў з вучня абяцанне, што калі ён перастане прагульваць, будзе старацца ў школе, то да канца навучальнага года ад усяго раёна атрымае жаданы падарунак.

Спатрэбілася сказаць гэта толькі раз. І вось да канца навучальнага года Вова больш ні разу не прапусціў заняткі ў школе, не атрымаў ніводнай заўвагі. У першы дзень канікулаў у дварэ школы стаяў загорнуты ў завадское пакаванне веласіпед. Да канца дня ніхто з вучняў не ведаў, для каго гэты падарунак.

— Мы з Ігарам Аляксандравічам прыехалі ў школу, каб уручыць падарунак дзіцяці. Не зрабілі гэта публічна, не збіралі ўвесь калектыў, дзяцей, — падзялілася Кацярына Ваўчок. — Тое, што адбывалася з хлопчыкам, якія эмоцыі яго перапаўнялі, цяжка перадаць, ён не мог вымавіць ні слова, так разгубіўся, што ўвесь пабялеў, так не верыў, што гэты веласіпед для яго.

На дарагі падарунак вясковаму школьніку, дарэчы, сабралі, як кажуць, крыха да крыхі. Веласіпед для хлопчыка набылі за ахвяраванні ад усіх членаў камісіі па справах непаўналетніх Гомельскага райвыканкама, кіраўнікоў школ раёна.

— Для дзіцяці гэта важны жыццёвы прыклад. Яно зразумее, што самы лепшы і правільны варыянт — рухацца ў пазітыўным напрамку. Калі ты займаешся тэхнікай, гэта пазітыўна і правільна, за добрыя паводзіны цябе заўсёды падтрымаюць, — упэўненая Кацярына Ваўчок.

Які фурор на сваёй вясковай вуліцы зрабіў новы веласіпед Валодзі, расказала маці падлетка. Алена Аляксееўна кажа, што проста няма слоў, як яна ўдзячная за такую каласальную падтрымку сына. Да таго ж і ў яе вельмі няпростым жыцці маці-адзіночкі гэты падарунак — як маячок: у цяжкую хвіліну жыццё пашле таго, хто працягне руку, не адвернецца.

— Я наогул шчаслівая маці, дзеці ў мяне добрыя, — прызнаецца жанчына. — І Воўка мой вельмі добры. Вы б ведалі, які ён рукасты! З тэхнікай як упраўляецца! Але, калі стаў прагульваць, я таксама адчувала сваю віну. Мяккая, можа, з ім занадта была. Моцна спалохалася, што калі не змагу сама наладзіць праблемы сына з вучобай, то, атрымліваецца, не спраўляюся, значыць, увогуле дрэнная я маці. Могуць і дзяцей забраць, а жыву ж толькі дзеля іх. Сын, думаю, гэта таксама зразумеў, не хацеў мяне хваляваць. Вельмі рада, што яго так падтрымалі, дапамаглі шмат што зразумець.

Мама Валодзі расказала, як сын шмат дзён баяўся чапаць, падыходзіць да новага веласіпеда. Паставіў яго ў пакоі малодшай сястры, яна якраз з'ехала з дому на канікулы: як у «музей» заходзіў паглядзець толькі на падарунак. Магчыма, падлетак, які доўгія гады забараняў сабе марыць пра дарагія рэчы, баяўся, што ровар забяруць назад. Сам хлопец інтэрв'ю не даў, але ёсць улоўленыя дэталі гэтай веласіпеднай гісторыі, якія шмат што могуць расказаць без слоў. Цяпер у сціплым дворыку Вовавага сямейства на прыбранай і пераабсталяванай верандзе з'явілася шыльда — «Гараж». Так сваёй рукой тэрыторыю любімых мужчынскіх тэхнічных інтарэсаў для сясцёр і мамы абазначыў Вова. У сваёй школе ў хлопца будучы навучальны год апошні. Веласіпед, а да яго круты электронны замок, падараны ў знак падтрымкі суседзямі, гараж, дзе можна далей майстраваць, наблізілі хлопца да мары. Яна простая — праз год паехаць вучыцца ў аграрна-тэхнічны прафесійны ліцэй у Касцюкоўцы, што недалёка ад дома, атрымаць прафесію трактарыста і вярнуцца працаваць у гаспадарку ў родным Аздзеліне.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота з архіва герояў.

Блізкая ўлада

ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 25 чэрвеня, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

• першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый Іванавіч КОЗЕЛ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь Іосіфавіч НЯВЕРА. Тэл. 8 015 273 56 44;

• намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан Барысавіч СТРАХАР. Тэл. 8 022 250 18 69;

• старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• першы намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Дзмітрый Міхайлавіч МІКУЛЁНАК. Тэл. 8 017 222 44 44.

Надвор'е

З НЯДЗЕЛІ ДА НАС ІДЗЕ НОВАЯ ХВАЛЯ СПЯКОТЫ — ДА 32!

А атрымалася ўсё вельмі проста: шмат'ярусная воблачнасць атмасферных франтоў, якія пагаршалі надвор'е ў нашай краіне ў першай палове гэтага тыдня, зрушылася на тэрыторыю Украіны. Зараз у вобласці павышанага атмасфернага ціску над нашай краінай назіраецца малавоблачнае надвор'е, што забяспечвае добры прагрэў паветра ў дзённыя гадзіны, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.



Калі 23 чэрвеня тэмпература паветра была блізкай да кліматычнай нормы, то ўжо 26 чэрвеня ў нашу краіну накіруецца вельмі цёплае паветра з Міжземнамор'я. З гэтага дня сярэдні фон тэмпературы паветра будзе на 4—6 градусаў вышэйшы за кліматычную норму. Але павышацца тэмпературны фон пачне ўжо з 24 чэрвеня.

У пятніцу тэрыторыя Беларусі будзе знаходзіцца пад уплывам антыцыклону з цэнтрам над краінамі Балтыі. Будзе стаяць пераменная воблачнасць. Без ападкаў. Вецер паўночны, паўночна-ўсходні ўмераны. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад плюс 23 градусаў да 28 цяпла.

Паводле інфармацыі цэнтра, антыцыкланальны характар надвор'я захаваецца як мінімум да пачатку наступнага тыдня, а гэта значыць, што істотных ападкаў па краіне не чакаецца.

У суботу захаваецца ўплыў антыцыклону, цэнтр якога перамесціцца на паўночны захад еўрапейскай часткі Расіі. Будзе пераважаць пераменная воблачнасць. Абсалютна чыстае неба, калі нават намёку на дожджык няма. Вецер усходняй чвэрці ўмераны. Тэмпература паветра мінімальная ўначы ад плюс 10 градусаў да 15 цяпла, а максімальная ўдзень складзе 24—29 градусаў са знакам плюс.

Паводле меркавання сіноптыкаў, 26 чэрвеня метэазалежным людзям будзе дастаткова цяжка і сонечным днём, і душнай ноччу. У гэтыя суткі працягне аказваць уплыў антыцыклон з цэнтрам над паўночным захадам еўрапейскай часткі Расіі. Надвор'ем будзе кіраваць пераменная воблачнасць. Пераважна без ападкаў. Вецер усходняй чвэрці ўмераны. Мінімальная тэмпература паветра ўначы будзе апускацца не ніжэй за плюс 12—17 градусаў, а максімальная ўдзень «стрэліць» да плюс 27—32 градусаў.

У Белгідрамецэ папярэдзілі, што ва ўмовах сухога і вельмі цёплага надвор'я ў Беларусі клас пажарнай небяспекі паступова ўзрасце да трэцяга (сярэдняя гарымасць).

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Рызыка выкарыстання ядзернай зброі стала найвышэйшай пасля халоднай вайны

Гэта адбылося ў сувязі з актыўным нарошчваннем арсеналаў краінамі «ядзернага клуба». Такая тэндэнцыя вынікае з даклада Стакгольмскага міжнароднага інстытута даследавання праблем міру (SIPRI), паведаміла ТАСС. Эксперты адзначаюць, што цяпер можна назіраць «дакладныя прыкметы таго, што працэс скарачэння ядзерных узбраенняў скончыўся», а «ўсе дзяржавы, якія ўваходзяць у «ядзерны клуб» (Расія, ЗША, Вялікабрытанія, Францыя, Кітай, Індыя, Пакістан, Ізраіль і КНДР), павялічваюць колькасць боегаловак і праводзяць мадэрнізацыю ядзерных арсеналаў». Даследчыкі падкрэсліваюць, што павышэнню напружанасці садзейнічае ў тым ліку ўзмацненне ролі атамнай зброі ў ваенных стратэгіях краін. Сітуацыя таксама абвастраецца значным пагаршэннем адносін паміж сусветнымі дзяржавамі. На думку аналітыкаў SIPRI, у хуткім часе, упершыню пасля заканчэння халоднай вайны, у свеце адбудзецца істотнае павелічэнне ядзерных арсеналаў. Пры гэтым удакладняецца, што такая тэндэнцыя можа стаць доўгатэрміновай і захоўвацца на працягу ўсяго наступнага дзесяцігоддзя.

Больш за палову амерыканцаў лічаць, што эканоміка ЗША разбураецца

Звыш 50 працэнтаў грамадзян ЗША лічаць, што ў іх эканоміцы ўжо пачалася рэцэсія. Аб гэтым паведаміла выданне Newsweek са спасылкай на індэкс эканамічнага аптымізму IBD/TIPP, перадала РІА «Навіны». Апошні індэкс паказаў, што 53 працэнты амерыканцаў лічаць: эканоміка знаходзіцца ў стане спаду. Пры гэтым, паводле даных выдання, яшчэ ў маі 48 працэнтаў апытаных амерыканцаў казалі, што эканоміка знаходзіцца ў стане спаду. Акрамя таго, большасць рэспандэнтаў выказала меркаванне, што сітуацыя найбліжэйшым часам не палепшыцца. Адзначаецца, што апасенні рэцэсіі ўзмацніліся за апошнія тыдні: на мінулым тыдні інфляцыя дасягнула 40-гадовага максімуму, а індэкс Dow Jones упаў ніжэй за 30 тысяч пунктаў упершыню за паўтара года. Акрамя гэтага, грамадзян ЗША непакоіць здольнасць Байдэна кіраваць эканомікай.

Парламент Балгарыі вынес вотум недаверу ўраду Петкава



Балгарскі ўрад на чале з прэм'ер-міністрам Кірылам Петкавым атрымаў вотум недаверу ад парламента краіны, паведамілі РІА «Навіны». Недавер Кабміну выказалі 123 парламентарыі, супраць адстаўкі выступілі 115 дэпутатаў. Галасаванне па вотуме недаверу ініцыявала балгарская партыя ГЕРБ («Грамадзяне за еўрапейскае развіццё Балгарыі»), якой кіруе экс-прэм'ер Бойка Барысаў. Яму ўдалося прыцягнуць на свой бок і іншыя апазіцыйныя партыі. Адзначаецца, што апазіцыя выступае супраць эканамічнай палітыкі ўрада. У прыватнасці, у краіне назіраецца імклівы рост інфляцыі.

ШМАТДЗЕТНЫМ СЕМ'ЯМ У МІНСКУ ПРАПАНУЮЦЬ УСЕ ВАРЫЯНТЫ: АД КАТЭДЖАЎ ДА САЦЫЯЛЬНАГА І АРЭНДНАГА ЖЫЛЛЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сёлета Мінску даведзена заданне па будаўніцтве 880 тысяч квадратных метраў жылля, з якіх 140 тысяч квадратных метраў — для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Яшчэ некалькі гадоў таму ў горадзе ўзводзілі не менш чым мільён «квадратаў». Будаўнічыя магутнасці нашых буйнапанэльных домабудаўнічых камбінатаў дазваляюць нам будаваць і значна больш, але... Варта, напэўна, улічваць і зямельныя магчымасці, якія ў сталіцы не гумовыя.

Умова трох спроб

У чаргавікоў карыстаецца попытам не толькі традыцыйная серыя панэльнага домабудавання, але і індывідуальнае жыллё, якое адпавядае сучаснаму іміджу Мінска і мае больш высокія спажывецкія якасці. «Што датычыцца шматдзетных сем'яў, то ім прапануецца шмат варыянтаў жылля. Гэта будаўніцтва тэрытарыяльна-вытворчых комплексаў, індывідуальнага жылля, катэджных забудоў, продаж гатовых кватэр, сацыяльнае і арэнднае жыллё. Тыя, хто жадае будавацца, выбіраюць для сябе прымальныя варыянты», — гаворыць спецыяліст.

Варта нагадаць, што па заканадаўстве на працягу года з дня пастаноўкі на ўлік вялікія сем'і павінны накіроўвацца на будаўніцтва. А на сёння гадавое заданне па шматдзетных сем'ях выканана на 53 %. За год, дарэчы, спецыялісты павінны накіраваць на будаўніцтва 1226 шматдзетных сем'яў.

Алена Лукашэвіч звярнула ўвагу і на той факт, што вялікія сем'і далёка не заўсёды з першага разу згаджаюцца на прапанаваныя ім варыянты будаўніцтва. Чаму? Як аказалася, праблема мае фінансавыя карані. Рэдка сустрэнеш шматдзетную сям'ю, у якой не было б ніякага жылля наогул. А яго наяўнасць уплывае на памер дзяржаўнай падтрымкі, якая аказваецца кліенту. Яно адымаецца з належнага сям'і нарматыву льготнага крэдытавання.

Складваецца гэтая сітуацыя, калі не заўсёды ў такіх сем'яў ёсць грошы на пакрыццё розніцы, а таксама не заўсёды ў банку гатовыя даць гэтым сем'ям крэдыт. Яшчэ хтосьці чакае жылля ў пэўным раёне. У выніку, напрыклад, вельмі многія адмаўляліся ад удзелу ў катэджнай забудове ў мікраёне «Сокал», дзе ўзводзяцца двух-чатырохпавярховыя таўнхаусы, даецца ўчастак. Некаторыя сем'і не жадаюць купляць машына-месца, калі кватэры прапануюцца разам з ім. Хтосьці хоча атрымаць некалькі сумежных кватэр замест адной вялікай. У апошнім выпадку чыноўнікі ідуць насустрач сем'ям, у якіх чацвёра і больш дзяцей.

Дарэчы, тут Алена Лукашэвіч нагадала, што ў заканадаўстве ёсць магчымасць аднясення сям'і ў канец чаргі ў выпадку, калі ёй як мінімум тройчы прапаноўвалася пабудаваць жыллё ў складзе ЖБВК або атрымаць сацыяльнае на працягу года.

«Спецыялісты нашага ўпраўлення ініцыіравалі змяненне ў Жыллёвы кодэкс, і ўрад ухваліў унясенне паправак, згодна з якімі трохразовая адмова на працягу каляндарнага года ад прапанаваных варыянтаў будаўніцтва з'яўляецца падставай для зняцця з уліку з магчымасцю аднаўлення потым з канца чаргі. Я ўпэўненая, гэта будзе стымуляваць людзей больш уважліва ставіцца да прапанаваных варыянтаў. Зрэшты, кватэры пасля поўнага апытання чаргі не застаюцца пустымі — іх прапануюць у далейшым іншым катэгорыям тых, хто мае патрэбу. У прыватнасці, сем'і, у якіх выхоўваюцца дзеці-інваліды і дзеці-сіроты, ахвотна адгукаюцца на ўдзел у будаўніцтве», — патлумачыла сітуацыю Алена Лукашэвіч.

Цікавасць да «спадарожнікаў» расце, у прыватнасці да Смалявічаў

Цяпер камерцыйная цана квадратнага метра новага жылля ў Мінску заўважна «кусаецца». Таму асаблівую цікавасць у пэўнай частку мінскіх чаргавікоў выклікае будаўніцтва жылля ў Смалявічах. Для такіх сталічных чаргавікоў і кошт квадратнага метра прывабны, акрамя таго, яны могуць атрымаць дзяржаўную фінансавую падтрымку, што не заўсёды магчыма пры будаўніцтве ў Мінску па сваёй катэгорыі. Адсюль і ўстойлівая высокі попыт на жыллё ў спадарожніку.

Акрамя таго, зараз дзяржаўныя органы, арганізацыі і прадпрыемствы таксама праявілі вялікі інтарэс да гэтай забудовы. Таму па ініцыятыве гарвыканкама быў распрацаваны і ў красавіку гэтага года прыняты Указ № 159, які ўнёс змены ва Указ № 466 «Аб будаўніцтве жылых дамоў у гарадах-спадарожніках г. Мінска». Дадзены дакумент дазваляе накіроўваць на будаўніцтва ў гарады-спадарожнікі не толькі чаргавікоў з адміністрацыяй раёнаў Мінска, але і ахвотных з ліку чаргавікоў дзяржорганаў, арганізацый і прадпрыемстваў. Механізм набору будучых жыхароў прадугледжаны заканадаўствам: на працягу месяца пасля абвяшчэння аб наборы на будаўніцтва ахвотныя з ліку чаргавікоў могуць падаць заявы. Пасля зверкі сістэматызуюцца, выбіраюцца тыя, хто даўжэй за ўсё знаходзіцца на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

«Прыкладна такая ж схема будзе дзейнічаць і для чаргавікоў прадпрыемстваў, калі мы ім станем выдзяляць квоты на будаўніцтва ў пэўных дамах, — патлумачыла Алена Лукашэвіч. — Магчыма, гэта будзе асобны дом для чаргавікоў прадпрыемстваў Мінска, як атрымалася з дзяржорганамі: яны выказалі цікавасць да будаўніцтва невялікіх дамоў на 58 кватэр. Некаторыя сілавікі ўжо пачынаюць будавацца. Паглядзім на колькасць ахвотных з боку прадпрыемстваў. Не набярэцца шмат — дадзім квоты на пэўную колькасць кватэр у залежнасці ад колькасці чаргавікоў. Цяпер мы збіраем праз адміністрацыі раёнаў заяўкі ад прадпрыемстваў, чые работнікі хацелі б палепшыць свае жыллёвыя ўмовы ў Смалявічах. Цікавасць праявілі МТЗ, МЗКЦ, звесткі ад іншых арганізацый працягваюць паступаць.

Між іншым, па даных ДВА «Мінскбуд», якое шмат будуе па дзяржзаказе, кошт квадратнага метра ў панэльных дамах для тых, хто мае патрэбу, не перавышае 1,7—1,8 тысячы рублёў.

У якасці арыенціра, згодна з заканадаўствам, бяруць сярэднямесячную зарплату па горадзе, пры гэтым прыбытак забудоўшчыка абмежаваны 5 %, а ўсе па каштарысе, на падставе якога фарміруецца кошт, праходзяць экспертызу на выключэнне дадатковых выдаткаў. У дамах індывідуальнага выканання з палепшанымі спажывецкімі якасцямі цэннік будзе вышэйшы. Напрыклад, у жылых будынках на вуліцы Скрыпнікава — на ўзроўні 2 тысяч рублёў за «квадрат».

Свежая інфармацыя ад практыкаў

Дырэктар УП «УКБ Мінгарвыканкама» Анжэла БАБАРЫКА расказала, якія аб'екты будуць пабудаваны сёлета ў Мінску і Смалявічах. Паводле яе слоў, асноўны напрамак дзейнасці ўпраўлення — будаўніцтва і забеспячэнне жыллём тых маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў грамадзян і шматдзетных сем'яў, якія пражываюць у сталіцы.

«Цяпер на прадпрыемстве будуецца 17 жылых дамоў — гэта 2947 кватэр, прыкладна 173 тысячы квадратных метраў. Сёлета плануецца да ўводу ў эксплуатацыю 92 тысячы квадратных метраў, — патлумачыла дырэктар. — З гэтых аб'ектаў — чатыры энергазберагальныя дамы ўводзяцца ў эксплуатацыю ў горадзе-спадарожніку Смалявічах, сёлета там з'явіцца яшчэ і дзіцячы садок. У наступным годзе плануецца будаўніцтва сярэдняй школы, а да 2025 года намечана пабудаваць яшчэ 17 жылых дамоў».

Што датычыцца сацыяльных аб'ектаў, якія будуць пабудаваны ў 2022 годзе ў Мінску, то 18-я школа і 23-ы дзіцячы садок у комплексе «Мір» будуць уведзены ў эксплуатацыю ўжо да пачатку навучальнага года. «На дадзены момант у школу завозіцца і манціруецца абсталяванне, практычна змантіравана ўся тэхналогія, а таксама завяршаецца добраўпарадкаванне, — заявіла Анжэла Бабарыка. — Ужо з удзелам кіраўніка дзяржавы адкрыта 9-я паліклініка. А ў 3—4-м квартале плануецца завяршыць будаўніцтва паліклінікі на вуліцы Розы Люксембург».

Анжэла Бабарыка таксама распавяла, што цяпер ідзе перадпраектная распрацоўка забудовы на пляцоўцы «Гулівера» на вуліцы Прытыцкага. Па праекце дэталёвай планіроўкі на гэтай тэрыторыі можна размясціць да 70 тысяч квадратных метраў жылля. Плануецца, што гэты дом будзе індывідуальнай канструкцыі з падземным паркінгам. Таксама на гэтай пляцоўцы плануецца пабудаваць пяць дамоў панэльнага домабудавання, з якіх частка прадугледжана для тых, хто мае патрэбу.

Мінск па вуліцах і скверах — у дэталях

Намеснік генеральнага дырэктара ДВА «Мінскбуд» Аляксандр ЯЦКО расказаў, дзе ў сталіцы прадугледжаны пляцоўкі для далейшага будаўніцтва жылля з дзяржадтрымкай.

У найбліжэйшы час пачнецца асваенне пад жыллёвае будаўніцтва новых пляцовак на вуліцы Выгоцкага і ў раёне вуліц Філімонава — Сталетава. ДВА «Мінскбуд» выступае заказчыкам па асваенні гэтых тэрыторый. На абедзвюх пляцоўках плануецца ўзвесці жыллё ў новай серыі завода эфектыўных прамысловых канструкцый. Прадпрыемства якраз сёлета завяршыла рэканструкцыю вытворчай базы і гатова выпускаць вырабы ў новай эканамічнай серыі, з сучаснымі планіроўкамі, добрым метражом кухняў і пакояў. Акрамя таго, ацяпляцца такія дамы будуць электрычнасцю — за кошт устаноўкі электракатлоў і воданагравальнікаў у кожнай кватэры.

Зараз завяршаецца працэс узгаднення і экспертызы праектнай дакументацыі па пазапляцовачных сетках і праекце забудовы ў раёне вуліцы Выгоцкага. «Плануем сёлета ўжо выйсці на пляцоўку, адпаведныя рэсурсы выдаткаваны. У суме на гэтай тэрыторыі пабудуем больш за 100 тысяч квадратных метраў жылля. Кватэры прызначаюцца для тых, хто мае патрэбу. Да жылля дададуцца дзіцячы садок і школа, — заўважыў Аляксандр Яцко. — Што датычыцца вуліц Філімонава — Сталетава, то цяпер ідзе работа па праектаванні двух дамоў. Плануем пачаць будаўніцтва ўжо ў гэтым годзе. Паралельна займаемся адсяленнем людзей з існуючага старога жылога фонду, які ўзводзіўся адразу пасля вайны і не адпавядае ўжо ніякім сучасным стандартам і нормам. Намечана сёлета пры наяўнасці фінансавання прыступіць да зносу ўжо адсяленых будынкаў. На гэтай тэрыторыі таксама з'явіцца больш за 100 тысяч квадратных метраў жылля.

Больш за тое, зараз актыўна забудоўваюцца мікраёны «Лошыца-7» і «Лошыца-8», у наступным годзе плануецца старт асваення пляцоўкі мікраёна «Лошыца-5», падкрэсліла намеснік дырэктара па эканамічных пытаннях УП «УКБ Мінгарвыканкама» Вікторыя Манава.

Сяргей КУРКАЧ.

ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **КУП «Солигорский горплодоовощторг»** (УНП 600122835), 223710, Минская обл., Солигорский р-н, г. Солигорск, ул. Набережная, д. 16, в лице ликвидатора ООО «Правовая Стратегия».

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **25 июля 2022 г. 09.00-17.00** на электронной торговой площадке BELTORGI.BY

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС
1	Контейнер разборный для хранения овощей, на металлическом каркасе с деревянным заполнением, размером 120*80*80 см, 20 шт.	1 160,00
2	Контейнер для хранения овощной продукции, неразборный, на металлическом каркасе с деревянным заполнением, размером 120*100*100 см, 1591 шт.	254 560,00
3	Контейнер для хранения овощной продукции, неразборный, на металлическом каркасе с деревянным заполнением, размером 120*100*100 см, 100 шт.	16 000,00
4	Ящик тарный ЯО-1, неразборный, деревянный, размером 120*100*120 см, 1186 шт.	59 300,00
5	Ящик тарный ЯО-1, неразборный, деревянный, размером 120*100*120 см, 100 шт.	5 000,00

Местонахождение – Минская обл., Солигорский р-н, г. Солигорск, ул. Набережная, д. 16. Телефон для ознакомления и осмотра тел. +375 29 698-53-53.

Для участия в торгах необходимо в срок с 25.06.2022 г. 09.00 по 22.07.2022 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и оплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

ООО «СпецРеализация»

объявляет о проведении четвертых повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «Агромилк-сервис» (УНП 190604562, 223070, Минская обл., Минский р-н, с/с Михановичский, АБЗ промбазы ООО «Спецкомплектимпэкс», комн. 9/1 (район дер. Дубовый Лес)), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства).

***Дата и время проведения торгов*: 11 июля 2022 года**. Начало – 10.00. Заявки принимаются с 24 июня 2022 года по 07 июля 2022 года.

Место проведения торгов: г. Минск, пр-т Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

Организатор торгов: ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.

Продавец: **ООО «Агромилк-сервис» (УНП 190604562)** в лице антикризисного управляющего – директора Частного унитарного предприятия по оказанию услуг «ЮрЛиния» Павловской В. Н.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 10 %. Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на Интернет-сайте http://bankrot.gov.by/» и http://www.specrealization.by/. Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.

Сведения о предыдущих торгах:

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 16 (29638) за 26.01.2022.
РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 52 (29674) за 17.03.2022.
РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 80 (29702) за 26.04.2022.
РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 103 (29725) за 28.05.2022

УНП 190055182

РУП «Институт недвижимости и оценки»

(Организатор аукциона) информирует
о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды сроком на три года имущества, принадлежащего **РУП «Белпочта»** (Продавец).

Лот № 1: часть изолированного помещения отделения связи с инв. № 500/D-683640, г. Минск, ул. Алеся Бачило, 12-3. Площадь – 121,8 м². Начальная цена с НДС – 514,61 руб.

Аукцион состоится **18.07.2022 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и Организатора аукциона ino.by

☎ Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

НАГОДА СВЯТКАВАЦЬ РАЗАМ

Ужо заўтра, 25 чэрвеня, тэлеканалу АНТ спаўняецца 20 гадоў. Незалежна ад таго, як мяняюцца сезоны, інфармацыйны парадак дня, запыты аўдыторыі, тут знаходзяць магчымасць не губляць сваіх гледачоў, таму што тэлевізійны інфапрадукт робяць сапраўдныя прафесіяналы.

Пацвердзіла тое і перамога ў пяці намінацыях на сёлетняй Нацыянальнай тэлевізійнай прэміі «Тэлевяршыня». Нагадаем, найвышэйшай адзнакай журы адзначыла рэжысёрска-пастаноўчую групу тэлепраекта АНТ «XII Нацыянальны конкурс прыгажосці «Міс Беларусь», серыю журналісцкіх расследаванняў тэлеканала, праграму палітычнага аглядальніка Ігара Тура «Прапаганда», найлепшай інфармацыйнай праграмай прызналі «Нашы навіны», а «Наша раніца» атрымала ўзнагароду як найлепшая ранішняя інфармацыйна-забаўляльная праграма. У новай намінацыі гэтага года «Адзіны фронт» за сумесную работу розных СМІ ў межах адной тэмы былі адзначаны рэпарцёр Андрэй Аляксандраў і аператар Іван Баравы.

У дзень нараджэння тэлеканал АНТ таксама будзе радаваць сваю аўдыторыю сюрпрызамі. Так, у выпуску «Наша раніца ў суботу» гледачоў чакае святочная «ялінка з падарункамі». А вечарам не прапусціце спецыяльны выпуск праграмы «Што? Дзе? Калі?»: каманда тэлевізіёншчыкаў згуляе супраць тэлегледачоў. У нядзелю глядзіце ў вячэрнім эфіры выпуск «20 гадоў АНТ. Нагода пагаварыць». А мы віншуем тэлеканал АНТ з надыходзячым днём нараджэння і жадаем яшчэ доўгія гады збіраць сваю аўдыторыю каля экранаў!

Алена ДРАПКО.

ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 168

З 13 да 15 чэрвеня ў Оршы адбылася адкрытая рэспубліканская спартакіяда школьнікаў па шашках-64. Перамагла каманда Гродзенскай вобласці. На другім месцы — шашысты Мінска, «бронза» — у Гомельскай вобласці.

№ 82



№ 82 Юрый Мурадаў (Барысаў)
Белыя простыя: a1, b4, d2, e1, f2, g1, g3, h2 (8)
Чорныя простыя: b8, c5, d6, e5, e7, f4, f6, g7, h4 (9)

Наступныя пазіцыі складзеныя вядучым аддзела.

№ 83
Белыя простыя: a1, b2, b4, c3, e1, f2, g1 (7)
Чорныя простыя: c5, d2, d4, d6, e5, e7, f4, h6 (8)

№ 84
Белыя простыя: d4, e3, f2, f4, h4 (5)
Чорныя простыя: b4, b6, c5, e7, h6 (5)

№ 85
Белыя простыя: c1, d4, e3, f2, f4, g3, h4 (7)
Чорныя простыя: b4, b6, c5, e7, h2, h6 (6)

№ 86
Белыя простыя: d2, g1, дамкі: a1, g3 (4)
Чорныя простыя: a5, c7, d6, f6, g7, дамка: b4 (6)

Кампазіцыі ў шашкі-100 склаў украінскі шашачны кампазітар Анатоль Баланюк.

№ 87
Белыя простыя: 23, 25, 28, 29, 33, 36, 38, 50 (8)
Чорныя простыя: 10, 14, 17, 20, 24, 39, 40, 44 (8)

№ 88
Белыя простыя: 11, 12, 17, 21, 35, 43, 44, 50 (8)
Чорныя простыя: 2, 14, 15, 26, 29, 32, 38, 41, 45 (9)

№ 89
Белыя простыя: 15, 18, 19, 20, 23, 28, 31, 34, 39 (9)
Чорныя простыя: 4, 7, 9,10, 14, 17, 25, 26, 45 (9)

22 чэрвеня 60-гадовы юбілей сустрэў мінскі майстар Яўген Бельскі. Сённяшнія кампазіцыі прысвячаюцца юбіляру.

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні:

№ 74 1. e1-d2 h4:f6 2. c7-b8 a5:c7 3. b8:g3 h2:f4 4. e3:e7 f8:d6 5. h6-g7 a3-b2 6. d2-c3 b2:d4 7. g7-f8 d6-e5 8. f8-g7 e5-f4 9. g7:c3 f4-g3 10. c3-d4 g3-h2 11. d4-g1 +

№ 75 1. e1-f2 h8:f6 2. f2-g3 h2:f4 3. c7-d8 a5:c7 4. d8:a3 +

№ 76 1. f2-g3 h2:d6 2. b4-c5 d6:d2 3. d4-e5 f6:d4 4. h4:c1 g7-h6 5. c1-d2 h6-g5 6. d2:h6 +

№ 77 1. f2-e3 d6:b4 2. e3-d4 a3:c1 3.d4-e5 f6:d4 4. g5-h6 c1:g5 5. h4:d8 h2:f4 6. d8-e7 f8:d6 7. h6:g5 b4-c3 8. g5-c1 +

№ 78 1. b6-c7 d8:d4 2. c1-b2 a3:g5 3. h4:d8 h2:f4 4. d8-f6 e5:g7 5. h6:g5 b4-c3 6. g5-c1
c3-b2 7. c1:a3+

№ 79 1. g1-f2 g3:e5 2. e1-d2 c3:g3 3. h2:f8 h6:d2 4. f8:b8+

№ 80 1. g1-f2 g3:e5 2. e1-d2 c3:g3 3. h2:b8 h6:f4 4. a1:c3 f4-e3 5. c3-d4 e3:c5 6. b8-e5 +

№ 81 1. g1-f2 g3:e5 2. e1-d2 c3:g3 3. h2:f8 h6:f4 4. f8:a3 +

Першымі дакладныя адказы даслалі: Л. Трафімчык (Іўе), А. і А. Высоцкія (г. Копыль), С. Рашэцін (Ашмяны), С. Бурко (Орша), В.Таўкачоў (Магілёўская вобл., Клімавіцкі р-н, в. Уздзевічы), У. В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі (усе Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), У. Ваўчкоў (Маладзечна).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

АСОБЫ І ІХ АДМЕТНЫЯ РОЛІ

На наступным тыдні ў эфіры тэлеканалаў па традыцыі будуць адзначаць юбілейныя даты. І, вядома, не абыдзецца без спецыяльных паказаў мастацкіх, дакументальных стужак, дзе аўдыторыя зноў зможа сустрэцца з любімымі акцёрамі, рэжысёрамі, тэлевядучымі.

Так, 28 чэрвеня споўніцца 60 гадоў вучоному-мовазнаўцу, доктару філалагічных навук, прафесару Віктару Іўчанкаву. І з аўторка да чацвярга ў вячэрнім эфіры ўвазе гледачоў прадставіць лекцыі Віктара Іўчанкава з праграмы «Кафедра». У прыватнасці, будуць асвятляцца такія тэмы, як «Маўленчыя працэсы сучаснасці: заміксуй паці на лайме і мяце; Правапіс у гістарычным вымярэнні: пішам Манчэстар, а чытаем Ліверпуль» (БТРК, 2021 г.), «Мова і штучны інтэлект: віртуальная форма зносін; Ці спраўдзіцца мара чалавецтва — гаварыць на адной мове» (БТРК, 2022 г.) і іншыя. А непасрэдна ў сам дзень нараджэння вучонага зможам убачыць у выпуску праграмы «Суразмоўцы» на «Беларусь 3».

У чацвер 30 чэрвеня кінематаграфічны свет будзе згадваць акцёра, народнага артыста СССР Уладзіміра Дружнікава ў дзень яго 100-гадовага юбілею. З гэтай нагоды на «Беларусь 3» пакажуць мастацкі фільм «Канстанцін Заслонаў», які выйшаў на кінастудыі «Беларусьфільм» у 1949 годзе. У кінастужцы акцёр задзейнічаны ў галоўнай ролі — вядомага партызана, Героя Савецкага Саюза.

12.15, 20.55, 0.45 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 0.00 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.35, 21.40 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
15.35, 16.50 «Паляванне на гаўляйтара». Серыял (12+).
20.25, 23.05 «СТБ-спорт».
20.30 «Сталічныя падрабязнасці».
20.40 «Міншчына».

МІР

5.00, 2.35 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» (12+).
5.25, 0.30 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
5.50, 10.10 Серыял «Экспрапрыятар» (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
13.15, 18.10 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.05, 16.15 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.10 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
17.25 «Міравое пагадненне» (16+).
19.25, 20.05 «Гульня ў кіно» (12+).
20.45, 21.35 «Слабае звяно» (12+).
22.25, 23.15 «Назад у будучыню» (16+).
0.00 «Сусветныя гульні розуму» (12+).
0.55 Маст. фільм «Волга-Волга».

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Аб самым галоўным» (12+).
12.35 «Кропкі над і» (16+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 «60 хвілін» (12+).
17.30 Серыял «Пісьмы на шкле» (12+).
20.35 «P.S.»
21.05 Серыял «Ганна Карэніна» (12+).
22.05, 23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

6.10 «Астрапрагноз».
6.15, 7.25, 8.25, 16.45, 19.55, 22.05, 22.30 Сёння. Галоўнае.
6.20 «Здорава здаровым быць!» (6+)
7.05 Сфера інтарэсаў.
7.40, 22.10 «НЗ.by».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.40, 23.45 Серыял «Дзяржаўная граніца» (12+).
10.35 Гісторыі выратавання (12+).
11.05 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч. Лёсы» (16+).
13.30 Надзвычайнае здарэнне.
14.00 Серыял «Шаман» (16+).
16.50 «За гранню» (16+).
17.50 «ДНК» (16+).
20.10 Серыял «Перасуд» (16+).
22.30 Серыял «Стэпавыя ваўкі» (16+).

8 канал

7.00, 15.05, 17.45, 21.05, 0.50 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад. «Гравіці Фолз».
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Цёмны крышталь» (12+).
8.30 Дакументальны экран.
9.40 Драма «Каралева Чхорын» (12+).

10.50 Трылер «Не час памяраць» (16+).
13.35 Серыял «Выдатнае стагоддзе» (16+).
15.10 Серыял «Хачу ў кіно» (6+).
15.20 Мультпарад «Чып і Дэйл».
16.05 Драма «Супярэчнасці кахання» (16+).
17.50 Серыял «Я адказваю за ўсё» (16+).
19.20 Серыял «Алібі» (16+).
20.55 «Вечарніца».
21.10 «Фэшн is my прафэшн» (12+).
21.20 Драма «Сёрфер душы» (12+).
23.05 «Злавіць злодзея» (12+).

ВТВ

6.00 «Лаві момант» (16+).
7.00 «Раніца з гумарам» (16+).
10.45 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
12.00 «Велабайкі» (16+).
12.30 «Дурні і дарогі» (16+).
13.00 Серыял «Анжаліка» (16+).
13.50 Серыял «Выжыць пасля» (16+).
14.45 «Мільёны ў сетцы» (16+).
15.40, 3.30 Серыял «Вароніны» (12+).
16.30 «Поўны блэкаўт» (16+).
17.30 Серыял «Пастукай у мае дзверы» (16+).
21.05 Серыял «Рэгбі» (16+).
0.35 Жахі «Прыварот. Чорнае вянчанне» (16+).
2.15 «Уральскія пельмені» (16+).
4.20 «Адна за ўсіх» (16+).
4.45 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.00 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...» [СЦ]
7.05 «Іншыя Раманавы» [СЦ].
7.35 Легенды сусветнага кіно.
8.05 Замежная справа [СЦ].
8.50 «Бронзавая птушка». Маст. фільм [СЦ].
10.15 «Каменная кветка. Уральскі сказ». Маст. фільм.
11.40 «Мой дом — мая слабасць». Дак. фільм [СЦ].
12.25 «Князь Пацёмкін. Святло і цені». Серыял [СЦ].
12.55 Academia.
13.45, 22.10 «Без віны вінаватыя». Серыял [СЦ].
14.30 Пернікавы домік [СЦ].
15.05, 1.05 Яўген Несцярэнка і Акадэмічны аркестр рускіх народных інструментаў.
15.50 «Энігма. Арцём Дзерваед».
16.30 «Мёртвыя душы». Галапад у двух дзеяннях. Спектакль Тэатра імя Яўгена Вахтангава.
19.00 Лісты з правінцыі [СЦ].
19.45 «Смеханастальгія».
20.15, 1.45 Шукальнікі [СЦ].
21.00 «Першыя ў свеце». Серыял.
21.15 Лінія жыцця [СЦ].
23.20 «У Кейптаўнскім порце...» Маст. фільм.
2.30 «Шэры Воўк энд Чырвоная Шапачка». М/ф для дарослых.

Настальгія

6.00 «Сняем, сябры!» (12+)
6.55 Маст. фільм «Шэрыя ваўкі» (18+).
8.40, 9.40, 11.00, 13.10, 14.40, 15.40, 17.00, 18.00, 19.15, 20.40, 21.40, 23.40, 1.00, 3.40, 5.00 Музычная настальгія.
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
12.00 «Яловая субмарына» (18+).
13.20 Маст. фільм «Крымінальны квартэт» (18+).
17.25, 23.00 «Блеф-клуб» (16+).
18.10 «Да і пасля...» (16+)
19.30 Маст. фільм «Урокі ў канцы вясны» (18+).
0.00 «Быў час» (16+).
1.20 Маст. фільм «101-ы кіламетр» (18+).

EuroSport 1

4.00, 9.30, 23.15 Веласпорт. «Тур дэ Франс» (16+).
6.00, 10.30 Веласпорт. «Джыра д'Італія» (16+).
7.30, 13.00, 2.30 Снукер (6+).
12.00 Спідвей (16+).
14.00, 14.45, 20.45 Веласпорт (16+).
22.00 Скалалажанне: Кубак свету.
0.35 Усе віды спорту (16+).
1.00 Кузаўныя аўтагонкі: Кубак свету (16+).

Кінакамедыя

0.30 Кіламанджара (16+).
2.00 Вельмі страшнае кіно (16+).
4.05 Вельмі страшнае кіно-2 (16+).
5.30 Вельмі страшнае кіно-3 (16+).
7.00 Маска Зора (12+).
9.30 Легенда Зора (6+).
11.55 Рэальныя кабаны (12+).
13.50 Сямейка Адамс (12+).
15.40 Каштоўнасці сямейкі Адамс (12+).
17.20 27 вяселляў (16+).

19.30 План Б (16+).

21.25 Чарапашкі-ніндзя-3 (6+).
23.15 Хлопец-каратыст (6+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
8.45 «Жыць далей» (16+).
10.30 «Паглядзім» (12+).
11.00 «Жорсткі Стамбул». Серыял (16+).
12.15, 1.05 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.05 «Сны» (16+).
14.00 «Старац» (16+).
14.30, 19.05, 2.45 «Варажбітка» (16+).
15.25 «Гэтая рэальная гісторыя» (16+).
16.20 «Пагоня за смакам» (16+).
17.15, 5.10 «Апакаліпсіс» (16+).
18.10, 1.55 «Сляпая» (16+).
20.00 «Мачаха» (16+).
22.15 «Тэрмінатар» (16+).
0.10 «Гарадскія легенды» (16+).
3.35 «Суд ідзе». Серыял (16+).

ТБ1000

5.20, 6.00, 17.20, 18.10 Доктар Хаус (16+).

7.00 Капітан Філіпс (16+).
9.20 Ізгой (12+).

11.55 500 дзён лета (16+).
13.30 Добра быць ціхоняй (16+).
15.20 У метры адно ад аднаго (16+).

19.00 Новы Чалавек-павук (12+).
21.25 Новы Чалавек-павук: высокае напружанне (16+).
23.50 Дзіўны Халк (16+).

1.45 Пасажыры (16+).
3.35 Дзіця робата (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30 Смяшарыкі (6+).
6.45 Фіксікі (6+).
8.10 Экіпаж (6+).
10.30, 23.55 На раёне (16+).
12.05 Статус: свабодны (16+).
13.45 Блокбастар (16+).
15.10 Населены вестраў (12+).
17.10 Населены вестраў: схватка (12+).
19.00 Мажор. Фільм (16+).
20.40 Цень зоркі (16+).
22.15 Рубеж (12+).
На раёне (16+).
1.30 Рускі рэйд (18+).
3.00 Васьмёрка (16+).
4.20 Зіма (16+).

National Geographic

6.00 Навуковыя глупствы (16+).
6.15, 7.05 Неверагодны доктар Пол (16+).
8.00, 8.50 У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
9.40, 10.35 Аўта-SOS (16+).
11.25 Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
12.15 Дзікі тунец (16+).
13.05, 14.00, 16.35, 19.15, 20.05, 1.55, 2.40 Расследаванні авіякатастроф (16+).
14.50, 15.45, 0.30, 1.15 Служба бяспекі аэрапорта (16+).
17.25 Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
18.20, 18.45 Фабрыка ежы (16+).
21.00, 21.50 Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
22.45 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
23.40 Дзіўны аэрапорт Нью-Ёрка (16+).
3.30 Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
4.15, 4.40 Зона будаўніцтва (16+).
5.00 Зрабіць за адзін дзень (16+).
5.10 Гульні розуму (16+).

ЯСНАе

5.10 Серыял «Чырвоныя горы» (16+).
6.45 Серыял «Афіцэры-2» (12+).
8.35 Серыял «Бандыцкі Пецярбург: Адвакат» (16+).
10.25 Серыял «Паляўнічыя на караваны» (16+).
12.00 Серыял «Чорныя кошкі» (12+).
13.35 Серыял «Апошні браняпоезд» (16+).
15.25 Маст. фільм «7-ы мяняе курс» (12+).
17.00 Серыял «Балада аб бомберы» (16+).
18.50 Маст. фільм «Агонь» (12+).
21.00 Інфармацыйны дайджэст «Час высокіх тэхналогій».
21.25 Маст. фільм «Загад «Знішчыць» (12+).
23.05 Маст. фільм «Хачу ў турму» (16+).
0.40 Маст. фільм «Рашала. Нулявыя» (18+).
2.10 Маст. фільм «Абуджэнне смерці» (18+).
3.40 Маст. фільм «След Сокала» (16+).

У праграме магчымы змяненні.
Перадрукоўка праграмы забаронена.
[СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

Беларусь 1

6.00, 7.30. 8.30 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.20, 8.20 Навіны эканомікі.
7.25, 8.25, 18.15 Зона Х (16+).
9.10 Серыял «След» (16+).
10.45 «OST». Фільм (12+).
11.45, 12.10. 13.05, 18.45, 19.20 Драма «Лёд, які не растае» (12+).
14.00 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
14.50, 15.25 Драма «Сэрца маці» (12+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Дача (12+).
17.30 Існасць [СЦ].
21.00 Панарама.
21.45 Клуб рэдактараў (16+).
23.05 Драма «Адзін удых» (12+).
0.45 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 18.20 Тэлебарометр.
9.05 Серыял «Сляпая» (16+).
10.00, 17.25 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
11.00 Серыял «Паўночнае ззянне. Таямніца вогненных рун» (16+).
12.45 «Сямейныя гісторыі» (16+) [СЦ].
13.15 Серыял «Жаночы доктар-5» (16+).
14.10 «На тыдзень» (16+).
14.55 «Веру не веру» (16+).
15.45,16.55 «Вось такія людзі» (12+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
18.25 «На нажах» (16+).
19.25 «Тата папаў» (16+).
21.10 Спортлато 5 з 36, КЕНА.
21.15 «Бітва экстрасэнсаў» (16+).
23.00 Серыял «Чакай мяне» (12+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня».
8.05, 12.00, 15.30, 20.30, 23.45 Навіны культуры.
8.15, 19.20 «Пастарайся застацца жывым». Маст. фільм (12+).
9.25, 18.20 «Вялікія бітвы». Дак. цыкл (12+).
10.15 «Артэфакты» [СЦ].
10.40, 17.00 «Пакуль стаяць горы». Маст. фільм (12+) [СЦ].
12.10 «Сіла веры».
12.40 «Наперад у мінулае».
13.05, 21.05 «Залатая рэчка». Маст. фільм (12+) [СЦ].
14.35 «Кадры жыцця».
15.40 «Сваімі словамі».
16.20 «Запіскі на палях» [СЦ].
16.45 «Беларускія калумбы. Бацька і сын Вількіцкія». Дак. фільм (12+).
19.10 «Дарога памяці».
20.40 «Калыханка» (0+).
22.40 Вечары з сімфанічным аркестрам. Канцэрт «Палацава-замкавая музыка Беларусі».

Беларусь 5

7.00 Хакей на траве. Кубак Беларусі. Жанчыны. «Рытм» (Гродна) — «Тэкстыльшчык-БарДУ» (Баранавічы).
8.25, 20.00 Плаванне. Адкрыты кубак Беларусі.
11.05 Між іншым.
11.25 Лёгкая атлетыка. Брыльянтавая ліга.
13.35 Планета спорту.
13.55 Баскетбол 3х3. Кубак Дружбы.
22.00 Спартыўныя бальныя танцы. Чэмпіянат Беларусі.
23.55 На шляху да ЧС-2022. Відэасапіс.

АНТ

6.00, 7.10, 8.10, 9.10 «Наша раніца».
6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ].
20.30 Нашы навіны.
10.00 «Жыць здорава!» (16+)
10.40 «Бесталковыя нататкі» (12+).
11.15 Серыял «Вялікая вайна» (16+).
13.15, 0.20 Серыял «Чужая мілая» (12+).
15.05, 16.20, 18.20 Інфармацыйны канал (16+).
17.30 «Трывожная кнопка» (16+).
18.45 «Поле цудаў» (16+).
20.00 Час.
21.15 «Дзве зоркі. Бацькі і дзеці» (12+).
23.00 «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі» (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
9.00, 23.10 «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.15, 20.40, 0.40 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.55 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.55, 21.30 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
16.50 «Рашэнне ёсць!»
17.20 Дак. праект (16+).
17.45 «Паляванне на гаўляйтара». Серыял (12+).
20.10, 23.05 «СТБ-спорт».
20.15 «Сталічныя падрабязнасці».
20.25 «Мінскчына».

МІР

5.00, 3.15 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» (12+).
7.10, 10.20, 13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
8.00, 11.15, 14.05, 16.20 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
8.45, 9.30, 12.05, 12.40, 15.10, 17.20 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
10.10 «У гасцях у лічбы» (12+).
19.15 «Слабае звяно» (12+).
20.05 Маст. фільм «Па сямейных абставінах» (12+).
22.30 Маст. фільм «Прыгоды прынца Фларызеля» (12+).
1.55 Маст. фільм «Музычная гісторыя».

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Аб самым галоўным» (12+).
12.35 «Кропкі над і» (16+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 «60 хвілін» (12+).
17.30 Фільм «Прадмет абажання» (12+).
20.45 Фільм «Экіпаж» (6+).
23.10 «Нямецкая Украіна. Ад гетмана да гаўляйтара». Фільм (16+).

НТБ—Беларусь

6.10 «Астрапрагноз».
6.15, 7.25, 8.25, 16.45, 19.55, 22.05, 22.30 Сёння. Галоўнае.
6.20 «Здорава здаровым быць!» (6+)
7.05 Сфера інтарэсаў.
7.40, 22.10 «НЗ.by».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.40 Серыял «Дзяржаўная граніца» (12+).
10.35 Гісторыі выратавання (12+).
11.05 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч. Лёсы» (16+).
13.30 Надзвычайнае здарэнне.
14.00 Серыял «Шаман» (16+).
16.50 «ДНК» (16+).
20.10 Серыял «Перасуд» (16+).
22.40, 23.55 Серыял «Стэпавыя ваўкі» (16+).

8 канал

7.00, 15.10, 19.15, 21.10, 0.50 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад. «Гравіці Фолз».
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Цёмны крышталь» (12+).
8.25 Дакументальны экран.
9.35 Драма «Каралева Чхорын» (12+).
10.40 Дэтэктыў «Галава Мядузы» (16+).
13.40 Серыял «Выдатнае стагоддзе» (16+).
15.15 Мультпарад «Чып і Дэйл».
16.00 Драма «Супярэчнасці кахання» (16+).
17.45 Серыял «Нулявы пацыент» (18+).
19.20 Камедыя «SuperАлібі» (16+).

20.55 «Вечарніца».
21.15 «На экране — героі камп'ютарных гульняў».

ВТБ

6.00 «Лаві момант» (16+).
7.00 «Раніца з гумарам» (16+).
10.45, 22.50 «КВЗ. Панашаму» (16+).
12.00 «Наш рамонт» (16+).
12.30 «Дурні і дарогі» (16+).
13.00, 16.30 Серыял «Анжаліка» (16+).
13.50, 0.00 Серыял «Выжыць пасля» (16+).
14.45 «Мільёны ў сетцы» (16+).
15.40, 2.35 Серыял «Вароніны» (12+).
17.25 Серыял «Івановы — Ивановы» (16+).
19.10 Серыял «Пастукай у мае дзверы» (16+).
20.00 Серыял «Рэгбі» (16+).
21.00 Камедыя «Дзённікі нянькі» (12+).
0.55 Серыял «Крамлёўскія курсанты» (12+).
3.25 «Адна за ўсіх» (16+).
4.45 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.30 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...» [СЦ]
7.05 «Іншыя Раманавы» [СЦ].
7.35 Легенды сусветнага кіно.
8.05, 1.45 Замежная справа [СЦ].
8.45 «Корцік». Маст. фільм [СЦ].
10.15 «Назіральнік».
11.10, 23.50 XX стагоддзе.
12.10, 0.45 Колер часу.
12.25 «Князь Пацёмкін. Святло і цені». Серыял [СЦ].
12.55 Academia.
13.45, 22.10 «Без віны вінаватыя». Серыял [СЦ].
14.30 Пернікавы домік [СЦ].
15.05, 1.00 Алібек Днішаў і Акадэмічны аркестр рускіх народных інструментаў.
15.50 «Раману Козаку прысвячаецца...» Дак. фільм [СЦ].
16.30 «Жаніцьба». Спектакль МХАТ імя А. П. Чэхава.
19.00 Лісты з правінцыі [СЦ].
19.45 «Галоўная роля».
20.05 «Рэжысёр Барыс Равенскіх». Дак. фільм [СЦ].
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.45 Штучны адбор.
21.30 «Драматургія аднаго лёсу». Дак. фільм [СЦ].
23.00 «Заўтра не памрэ ніколі». Серыял [СЦ].
2.30 Раман у камені.

Настальгія

6.00 «СевАлогія» (18+).
6.50, 8.40, 9.40, 11.00, 13.00, 15.40, 17.00, 20.40, 21.40, 23.00, 2.40, 3.40 Музычная настальгія (12+).
7.20 Маст. фільм «Брунэтка за 30 капеек» (18+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 0.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
12.00 «Быў час» (16+).
13.20 Маст. фільм «11-ы кіламетр» (18+).
18.00 «Спяем, сябры!» (12+)
18.55 Маст. фільм «Шэрыя ваўкі» (18+).
1.05 Маст. фільм «Аршын Мал Алан» (12+).
3.55 Маст. фільм «Жонка Сталіна» (18+).

EuroSport 1

4.00, 5.30, 9.30, 10.30, 11.30, 13.30, 14.05, 15.30, 17.00, 19.00, 21.30, 0.35, 2.05 Веласпорт (16+).
7.30, 2.30 Снукер (6+).
12.00 Кузаўныя аўтагонкі (16+).
12.30 Спідвей (16+).
19.30 Веласпорт. «Тур дэ Франс».
21.00 Усе віды спорту (16+).
22.05 Конны спорт (6+).
23.00 Каратэ (16+).
0.00 Гольф. Гольф (6+).

Кінакамедыя

0.55 Ружовая Пантэра (12+).
2.30 Ружовая Пантэра-2 (12+).
4.00 Кіліманджара (16+).
5.25 Каханне прэ-а-партэ (12+).
7.00 Голы пісталет (16+).

8.35 Голы пісталет-2 1/2: пах страху (12+).
10.05 Голы пісталет 33 1/3: апошні выпад (16+).
11.35 Хлопец-каратыст (6+).
14.00 Шалёна закаханы (16+).

15.55 Выкідала (18+).

17.35 Рэальныя кабаны (12+).
19.30 Мужчына па выкліку-2 (16+).
21.00 Чарапашкі-ніндзя (12+).
22.40 Маска Зора (12+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
8.55 «Жыць далей» (16+).
10.40 «Перыскоп» (16+).
11.00 «Жорсткі Стамбул». Серыял (16+).
12.15 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.10, 17.30 «Сны» (16+).
14.05, 18.25 «Старац» (16+).
14.35, 19.35, 3.15 «Сляпая» (16+).
15.30, 20.35, 4.05 «Варажбітка» (16+).
16.25 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
19.00 «Чытальнік» (12+).
21.35 «Смерць у аб'ектыве» (16+).
22.30 «Гамора» (16+).
0.05 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
1.00 «Лінія абароны» (16+).
1.30 «Немагчымае» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Серыял (16+).

ТБ1000

5.50, 6.30, 17.20, 18.10 Доктар Хаус (16+).
7.30 Мірны воін (12+).

9.40 Каратэ-пацан (12+).
12.05 Авіятар (16+).
15.10 Сукупнасць хлусні (16 +).

19.00 Змешаныя (12+).
21.00 Прыкінься маёй жонкай (16+).
23.00 Мільянер паняволі (12+).
0.40 Капітан Філіпс (16+).
2.45 Ізгой (12+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30 Смяшарыкі (6+).
7.05 Фіксікі (6+).
8.45 Васьмёрка (16+).
10.10 Каробка (12+).
11.55 Эластыка: дванаццаты гулец (16+).
13.10 Статус: свабодны (16+).
14.55 Пятніца (16+).
16.25, 17.00, 17.45, 18.20 Насця, збярыся! (16+)
19.00 Дзяўчыны бываюць розныя (16+).
20.35 Вострыў шанцавання (12+).
22.05 Вайна полаў (16+).
23.35 Хардкор (18+).
1.10 Як падняць мільён. Споведзь z@drota (18+).
2.40 Наша Russia. Яйкі лёсу (16+).
4.00 Жыццё напарадзе (16+).

National Geographic

6.00 Навуковыя глупствы (16+).
6.10, 6.55 Сесар Мілан: галоўны ў зграі (16+).
7.50, 8.45 У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
9.40, 10.30 Аўта-SOS (16+).
11.25 Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
12.15, 21.00, 3.35 Дзікі тунец (16+).
13.05, 14.00, 19.15, 20.05, 2.00, 2.50 Расследаванні авіякатастроф (16+).
14.50, 15.40, 0.30, 1.20 Служба бяспекі аэрапорта (16+).
16.35 Даследчык (16+).
17.25 Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
18.20, 18.45 Фабрыка ежы (16+).
21.50 Інстынкт выжывання (16+).
22.45, 23.35 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
4.20 Найцяжэйшы ў свеце рамонт (16+).
5.10 Гульні розуму (16+).

ЯСНАе

5.35 Серыял «Чырвоныя горы» (16+).
7.10 Серыял «Афіцэры» (12+).
8.55 Серыял «Бандыцкі Пецярбург: Адвакат» (16+).
10.45 Серыял «А золкі тут ціхія» (12+).
12.20 Серыял «Па законах ваеннага часу-3» (12+).
14.05 Серыял «Крэмень. Вызваленне» (16+).
15.50 Серыял «Наркамаўскі абоз» (16+).
17.35 Серыял «Балада аб бомберы» (16+).
19.25 Серыял «Апошні браняпоезд» (16+).
21.15 Маст. фільм «Ціхая застава» (12+).
22.50 Маст. фільм «Хада хаосу» (16+).
0.45 Маст. фільм «Адрэналін-2» (18+).
2.20 Серыял «Вайна на заходнім напрамку» (16+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.00 Зона Х (16+).
9.10, 22.15 Серыял «След» (16+).
10.45, 0.35 «Скажынемаўчы».
11.45, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 Драма «Курорт колеру хакі» (12+).
14.00 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
14.45, 15.25 Драма «Сэрца маці» (12+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларускі час.
21.00 Панарама.
21.45 Адзін дзень (12+).
23.45 Сфера інтарэсаў.
0.20 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 18.10 Тэлебарометр.
9.05, 20.05 Серыял «Сляпая» (16+).
10.00, 17.20 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
11.00 Серыял «Следчы Гарчакова» (16+).
13.05 «Камень, нажніцы, папера» (16+).
13.35, 21.15 Серыял «Жаночы доктар-5» (16+).
14.25 «На тыдзень» (16+).
15.05, 22.15 «Веру не веру» (16+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
16.55 «Вось такія людзі» (12+).
18.15 Серыял «Паўночнае ззянне. Таямніца вогненных рун» (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
23.15 «Гаспадыня лёсу». Серыял (16+).
0.10 «Да сустрэчы» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.10 «Беларуская кухня».
8.05, 12.00, 16.10, 20.30, 23.45 Навіны культуры.
8.15, 19.10 «Канстанцін Заслонаў». Маст. фільм (12+) [СЦ].
9.35, 18.20 «Вялікія бітвы». Дак. цыкл (12+).
10.25 «Дарога памяці».
10.35 «Артэфакты» [СЦ].
11.00, 17.25 «Аляксандраўскі сад-3». Серыял (16+) [СЦ].
12.40 «Наперад у мінулае».
13.05, 21.05 «Зніклая экспедыцыя». Маст. фільм (12+) [СЦ].
15.15 «Кадры жыцця».
16.20 «Сваімі словамі».
17.00 «Запіскі на палях» [СЦ].
20.40 «Калыханка» (0+).
23.15 «Кафедра».

Беларусь 5

7.00, 17.00, 23.00 Плаванне. Адкрыты кубак Беларусі.
9.00 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. БАТЭ (Барысаў) — ФК «Слуцк».
10.55 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. ФК «Гомель» — «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна).
12.50 Хакей на траве. Кубак Беларусі. Жанчыны. «Рытм» (Гродна) — «Тэкстыльшчык-БарДУ» (Баранавічы).
14.25 Між іншым.
14.45 Фактар сілы.
15.20 Хакей на траве. Кубак Беларусі. Жанчыны. «Вікторыя» (Смалявічы) — ХК «Мінск»
16.50, 20.50 Спорт-цэнтр.
19.30 Хакей на траве. Кубак Беларусі. Жанчыны. «Рытм» (Гродна) — «Тэкстыльшчык-БарДУ» (Баранавічы).
21.00 Лёгкая атлетыка. Брыльянтавая ліга.

АНТ

6.00, 7.15, 8.15 «Наша раніца».
6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
7.10, 8.10 «Трывожная кнопка» (16+).
9.10 «Аб'ектыўНа» (16+).
10.15 «Жыць выдатна!» (16+)
11.15 Серыял «Вялікая вайна» (16+).
13.15, 23.00 Серыял «Самы лепшы муж» (16+).
15.05, 16.20, 18.20 Інфармацыйны канал (16+).
21.15 «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
21.55 Серыял «Місія «Аметыст» (16+).
0.45 Час.

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
9.00, 23.10 «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.15, 20.50, 0.45 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 0.00 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.35, 21.40 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
15.35, 16.50 «Паляванне на гаўляйтара». Серыял (12+).
20.20, 23.05 «СТБ-спорт».
20.25 «Сталічныя падрабязнасці».
20.35 «Міншчына».

МІР

5.00, 2.40 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» (12+).
7.10, 10.10, 13.15, 18.10 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
8.00, 11.00, 14.05, 16.15 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
8.45, 9.30 11.45, 12.30, 15.10 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
17.25 «Міравое пагадненне» (16+).
19.25, 20.05 «Гульня ў кіно» (12+).
20.45, 21.35 «Слабае звяно» (12+).
22.25, 23.15 «Назад у будучыню» (16+).
0.00 «Сусветныя гульні розуму» (12+).
0.30 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
0.55 Маст. фільм «Настаўнік».

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Аб самым галоўным» (12+).
12.35 «Кропкі над і» (16+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 «60 хвілін» (12+).
17.30 Серыял «Пісьмы на шкле» (12+).
21.05 Серыял «Ганна Карэніна» (12+).
22.05, 23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

6.10 «Астрапрагноз».
6.15, 7.25, 8.25, 16.45, 19.55, 22.05, 22.30 Сёння. Галоўнае.
6.20 «Здорава здаровым быць!» (6+)
7.05 Сфера інтарэсаў.
7.40, 22.10 «НЗ.by».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.40, 23.45 Серыял «Дзяржаўная граніца» (12+).
10.35 Гісторыі выратавання (12+).
11.05 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч. Лёсы» (16+).
13.30 Надзвычайнае здарэнне.
14.00 Серыял «Шаман» (16+).
16.50 «За гранню» (16+).
17.50 «ДНК» (16+).
20.10 Серыял «Перасуд» (16+).
22.30 Серыял «Стэпавыя ваўкі» (16+).

8 канал

7.00, 15.00, 19.05, 21.10, 0.35 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад. «Гравіці Фолз».
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Цёмны крышталь» (12+).
8.25 Дакументальны экран.
9.15 Драма «Каралева Чхорын» (12+).
10.25 Дэтэктыў «Тварам да твару» (16+).
13.30 Серыял «Выдатнае стагоддзе» (16+).

15.05 Мультпарад «Чып і Дэйл».
15.30 Драма «Супярэчнасці кахання» (16+).
17.15 «Гатуй як шэф».
17.25 Серыял «Нулявы пацыент» (18+).
19.10 Серыял «Алібі» (16+).
20.45 «Вечарніца».
21.00 «Салам алейкум, Беларусь!»
21.15 Камедыя «Закахаць і абяшкодзіць» (16+).
23.05 Баявік «Сардэчна запрашаем у Зомбілэнд».

ВТБ

6.00 «Лаві момант» (16+).
7.00 «Раніца з гумарам» (16+).
10.45, 22.50 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
12.00 «Гатуем як шэф» (16+).
12.30 «Дурні і дарогі» (16+).
13.00, 16.30 Серыял «Анжаліка» (16+).
13.50, 0.00 Серыял «Выжыць пасля» (16+).
14.45 «Мільёны ў сетцы» (16+).
15.40, 2.35 Серыял «Вароніны» (12+).
17.25 Серыял «Івановы—Ивановы» (16+).
19.10 Серыял «Пастукай у мае дзверы» (16+).
20.00 Серыял «Рэгбі» (16+).
21.00 Камедыя «Выпускны» (16+).
0.55 Серыял «Крамлёўскія курсанты» (12+).
3.25 «Адна за ўсіх» (16+).
4.45 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.30 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...» [СЦ]
7.05 «Іншыя Раманавы» [СЦ].
7.35 Легенды сусветнага кіно.
8.05, 1.45 Замежная справа [СЦ].
8.45 Колер часу.
8.50 «Бронзавая птушка». Маст. фільм [СЦ].
10.15 «Назіральнік».
11.10, 23.50 XX стагоддзе.
12.25 «Князь Пацёмкін. Святло і цені». Серыял [СЦ].
12.55 Academia.
13.45, 22.10 «Без віны вінаватыя». Серыял [СЦ].
14.30 Пернікавы домік [СЦ].
15.05, 1.00 Ірына Архіпава і Акадэмічны аркестр рускіх народных інструментаў.
15.50 «Белая студыя».
16.30 «Вяселле Крэчынскага». Спектакль Тэатра імя Массавета.
19.00 Лісты з правінцыі [СЦ].
19.45 «Галоўная роля».
20.05 «Рэжысёр Барыс Равенскіх». Дак. фільм [СЦ].
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.45 Штучны адбор.
21.30 «Энігма. Арцём Дзерваед».
23.00 «Заўтра не памрэ ніколі». Серыял [СЦ].
2.30 Раман у камені [СЦ].

Настальгія

6.00 «Быў час» (16+).
7.00, 9.40, 11.00, 14.40, 15.40, 17.00, 19.10, 20.40, 21.40, 23.00, 0.50, 2.40, 3.40, 5.00 Музычная настальгія.
7.20 Маст. фільм «101-ы кіламетр» (18+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
12.00 «Спяем, сябры!» (12+)
12.55 Маст. фільм «Шэрыя ваўкі» (18+).
18.00 «Яловая субмарына» (18+).
19.20 Маст. фільм «Крымінальны квартэт» (18+).
23.25 «Блеф-клуб» (16+).
0.00 «СевАлогія» (18+).
1.20 Маст. фільм «Брунэтка за 30 капеек» (18+).

EuroSport 1

4.00, 10.30, 14.00, 18.00, 23.30 Веласпорт. «Тур дэ Франс» (16+).
7.30, 13.00, 2.30 Снукер: The Players Championship (6+).
9.30 Гольф. Гольф: PGA Tour (6+).
10.00, 16.45 Веласпорт (16+).
12.00, 12.30 Кузаўныя аўтагонкі: Кубак свету (16+).
15.00, 22.00 Веласпорт. «Джыра д'Італія».
20.05 Усе віды спорту (16+).
20.30 Снукер (6+).

Кінакамедыя

1.10 Легенда Зора (6+).
3.50 Сястрычка, дзейнічай (12+).
5.35 Сястрычка, дзейнічай-2 (12+).
7.40 Паляўнічыя на прывідаў (6+).

9.35 Тэрнер і Хуч (16+).
11.25 Голы пісталет (16+).
13.00 Голы пісталет-2 1/2: пах страху (12+).
14.35 Голы пісталет 33 1/3: апошні выпад (16+).
16.05 Мужчына па выкліку-2 (16+).
17.35 Сямейка Адамс (12+).
19.30 Каштоўнасці сямейкі Адамс (12+).
21.05 Чарапашкі-ніндзя-2: таямніца ізумруднага зелля (6+).
22.40 Кілеры (16+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
8.45 «Жыць далей» (16+).
10.30 «Улецы» (12+).
11.00 «Жорсткі Стамбул». Серыял (16+).
12.15 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.10, 17.30 «Сны» (16+).
14.05, 18.25 «Старац» (16+).
14.40, 19.30, 3.40 «Сляпая» (16+).
15.35, 20.30 «Варажбітка» (16+).
16.30 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
19.00 «Чытальнік» (12+).
21.30 «Смерць у аб'ектыве» (16+).
22.25 «Гамора» (16+).
0.00 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
0.50 «10 самых» (16+).
1.20 «Гладыятар» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Серыял (16+).

ТБ1000

5.15, 5.55, 17.20, 18.10 Доктар Хаус (16+).
6.50 Мільянер паняволі (12+).
8.35 Прыкінься маёй жонкай (16+).
10.35 Змешаныя (12+).
12.35 Жонка падарожніка ў часе (16+).
14.25 Загадкавая гісторыя Бенджаміна Батана (16+).
19.00 500 дзён лета (16+).
20.40 Добра быць ціхоняй (16+).
22.25 У метры адно ад аднаго (16+).
0.25 Авіятар (16+).

3.10 Сукупнасць хлусні (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

5.30 Смяшарыкі (6+).
6.25 Фіксікі (6+).
7.30 Элефант (12+).
8.55 Тарыф навагодні (16+).
10.20 Наша Russia. Яйкі лёсу (16+).
11.50 Дзяўчыны бываюць розныя (16+).
13.20 Востраў шанцавання (12+).
14.50 Вайна полаў (16+).

16.25, 17.00, 17.35, 18.10 Насця, збярыся! (16+)
19.00 Халоп (12+).
20.55 Блокбастар (16+).
22.20 Ярды (16+).
23.50 Як падняць мільён. Споведзь z@drota (18+).
1.25 Населены востраў (12+).
3.20 Населены востраў: схватка (12+).
4.15 Зіма (16+).

National Geographic

6.00 Навуковыя глупствы (16+).
6.10, 7.00 Сесар Мілан: галоўны ў зграі (16+).

ЯСНАе

4.45 Серыял «Чырвоныя горы» (16+).
6.20 Серыял «Афіцэры» (12+).
8.05 «Ясна аб футболе».
8.40 Серыял «Бандыцкі Пецярбург: Адвакат» (16+).
10.30 Серыял «Паляўнічыя на караваны» (16+).
12.10 Серыял «Чорныя кошкі» (12+).
13.45, 19.10 Серыял «Апошні браняпоезд» (16+).
15.35 Серыял «Наркамаўскі абоз» (16+).
17.20 Серыял «Балада аб бомберы» (16+).
21.00 «У адкрытым доступе».
21.30 Маст. фільм «Ржэў» (16+).
23.30 Маст. фільм «Крымінальны квартэт» (16+).
1.00 Маст. фільм «Справа для сапраўдных мужчын» (12+).
2.10 Маст. фільм «Ваўчыная зграя» (12+).
3.40 Маст. фільм «Сыны Вялікай Мядзведзіцы» (12+).
7.50, 8.45 У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
9.40, 10.35 Аўта-SOS (16+).
11.25 Дзікі тунец: Поўначсупраць Поўдня (16+).
12.15, 16.35 Дзікі тунец (16+).
13/05, 14.00, 19.15. 20.05, 21.00, 21.50, 2.00, 2.45, 3.30 Расследаванні авіякатастроф (16+).
14.50, 15.45, 0.25, 1.15 Служба бяспекі аэрапорта (16+).
17.30 Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
18.20, 18.45 Фабрыка ежы (16+).
22.40 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
23.35 Дзіўны аэрапорт Нью-Ёрка (16+).
4.15, 4.40 Зона будаўніцтва (16+).
5.10 Гульні розуму (16+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

НАЙЛЕПШЫ ПАЧАСТУНАК ДЛЯ ЗЯЦЯ

...Сяргей — хлопец вясковы і, дзякуй богу, здаровы. У свае 22 ён ніякіх хвароб не ведаў. Кашляў, і тое ў першым класе, а калі нехта казаў, што галава баліць і трэба ісці да доктара, ён, як у тым анекдоце, мог пальцам пакруціць ля скроні: маўляў, костка — што там можа балець? Не верыў, карацей, нават слухаць не хацеў! Але ж...

Быў у яго блізкі сябрук — Мікіта, а ў таго — родная цётка. У Мінску жыла, але ж да сваёй сястры — маці Мікіты — у госці прыязджала. Песціла пляменніка. Неяк раз такія крутыя джынсы прывезла. І зусім задарма... Сяргею такіх падарункаў ніхто не рабіў. «Пашчасціла табе з цёткай, — пазайздросціў неяк Мікіту. — Багатая... Не скупая...» — «Але ж вельмі хворая!» — падхапіў размову сябрук. «Яшчэ што скажы, — насцярожыўся дружбак. — Нізашто не паверу, каб такая маладая, прыгожая...» — «Але ж гэта праўда, — цяжка ўздыхнуў Мікіта. — Цукровы дыябет у яе, а з гэтай хваробай дурныя жарты. Кажуць, у любую хвіліну можна памерці». — «Ды быць не можа!»

Сяргей трымаўся свайго: не можа! Але дыябетам усё ж зацікавіўся: стаў распытваць пра яго сімптомы.

Мікіта ведаў, на жаль, няшмат. Сказаў, што хворым нельга нічога салодкага, што іх пастаянна «смажыць», што ўвесь час ім хочацца есці...

Далейшую размову перапыніў званок на мабільны. Сяргею тэлефанавала яго нявеста — Алёнка. «Ты не забыўся? Мы сёння ў госці ідзём, — нагадвала жаніху. — Мая хросная ўжо чакае. Я вас пазнаёмлю, і ты ўбачыш, яна такая кулінарка!.. Я ёй хіба крышку дапамагла, а ўжо ж накаштавалася... Жоўценькую курачку з'ела... Зараз збегаю дамоў — піць вельмі хочацца...»

Алёнка шчабятала нешта яшчэ, а ў душы Сяргея ўжо ўладарыў страх: «пазлы» склаліся: «Усяго накаштавалася, а потым яшчэ і курачку?! Што — цэлую?! Жоўтую ад тлушчу? Гэта ж вельмі шмат!.. Цяпер ёй хочацца піць?.. Дык усё супадае! Вось гора дык гора! У маёй Алёнкі таксама дыябет».

Бацькам пра яго нічога казаць не буду, вырашыў Сяргей. Хіба потым, пасля вяселля... А на ім перад нявестай трэба паставіць бутэльку з вадой... І ежу паціху падкладваць, а то госці заўважаць, што многа есць...

«Нічога, мы справімся, — думаў жаніх далей. — Я ў дошку разаб'юся — Алёнку вылечу!»

Вечарам, як дамаўляліся, яны ўдваіх пайшлі да хроснай. Ганна Іванаўна сапраўды і чакала, і рада была, і гэтакі стол накрыла...

Першае, што Сяргей заўважыў на ім, было блюда пернікаў у выглядзе... жоўтых курачак.

Пра лепшы пачастунак жаніх і не марыў!

Зоя Наваенка,
г. п. Падсвілле.

КАБ МЕЦЬ, ТРЭБА ЎМЕЦЬ

У Чарлі Чапліна, класіка нямога кіно, ёсць фільм пад назвай «Малы». Сюжэт яго вельмі просты: мужчыну падкінулі немаўля — ён гадамі гадаваў. А каб на гэта грошы мець, стварыў свайго роду «арцель». Зранку ставіў сыну задачу: «Сёння ідзём працаваць на Пятую-Стрыт»...

І вось той малы ўжо ідзе па вуліцы, каменьчыкамі разбівае шыбы ў вокнах кватэр на першых паверхах ды ўцякае ад раз'юшаных гаспадынь. А да іх — амаль у гэты ж час — ужо крочыць бацька з кантэйнерам шкла за спінай. Жанчыны тут жа спыняюць яго, просяць, каб зашкліў разбітыя вокны, плацяць грошы і дзякуюць...

Нешта трохі падобнае, як расказвала адна знаёмая, адбывалася ў іх на лецішчы:

«Пад яго мы з мужам хатку ў вёсцы купілі, — гаварыла жанчына. — Досыць часта выязджаем туды, працуем, адпачываем... З гэткай жа мэтай (калі дазлоўна, то «Каб вырошчываць і ўжываць экалагічна чыстыя сельгаспрадукты») у нас магілёвец адзін з'явіўся. Што ён сеяў-садзіў на сваім участку ды чаму без жонкі, не вельмі і цікава было: у сваёй сям'і разабрацца б, са сваім гародам управіцца. А вось Пахом часцяком да суседзяў заходзіў. Праўда, не ў хату: момант лавіў, каб гаспадары ў градах былі, на падворках. Ён тады ветліва так павітаецца — папытаецца, чаму лісце ў часнаку жаўцее, як вывесці тлю з парэчак, чым агуркі падкарміць...

Мы ж з дарагой душой, што называецца: усё расказвалі яму, паказвалі, дзяліліся ўгнаеннямі, бо свой жа чалавек як быццам! Нечым цікавіцца, — значыць, хоча выразіць... Дурнога, карацей, анікто падумаць не мог, хоць падставы, здаецца, і былі: у адным гародзе нейкі «дабрадзей» клубніцы выбраў, у другім — спелыя памідоры паздымаў, у трэцім — паўгрядкі бульбы выкапаў, а ўжо найлепшыя качаны капусты — дык шмат у каго...

Мы думалі, гэта ж горад непадалёк: на розных бомжыкаў грашылі, хоць нікога з іх і не бачылі, а таму злавіць не маглі...

Злодзей сам у пастку папаўся, бо свет, як высвятляецца, вельмі цесны.

Неяк раз трапілі мы з мужам у адну кампанію. За сталом разгаварыліся, хто што пасеяў-пасадзіў, што выразіў. Вось адна жанчына і расказвае, як зямля ды праца могуць людзей змяніць. Маўляў, Клаўка, суседка мая, свайго Пахома за чалавека не трымала, бо такі гультай, такі абібок!.. Гадамі нідзе не працаваў — капейкі ў дом не прыносіў, а калі яму ў канапе праседзеў, брат яму хату ў вёсцы купіў. І — не паверыце — чалавека як падмянілі! Ездзіць туды, працуе, жонку проста закідаў прадуктамі: то ягады вязе, то агуркі з памідорамі, то бульбу маладую... А ўжо ранняй капусты дык і мне адтуль перапала...

Удакладняем: «А ў якой жа вёсцы ўсё гэтак расце?» Жанчына тут жа ўспомніла! Так і ёсць: наша!

Мы потым схадзілі да таго «стаханаўца», паглядзелі. Ён на сваёй сялібе толькі пустазелле трохі абкошваў, а садзіць — нічога не садзіў».

...Праўду кажуць: каб мець, трэба ўмець. А хоць бы і красці, калі сумлення няма.

Валерый Гаўрыш,
г. Чавусы.

САРОКА САРОКУ БАЧЫЦЬ ЗДАЛЁКУ...

Будаваў я колісь дачу
А пад вокнамі — сусед.
Частавата яго бачыў —
Раскусіць не мог як след.
Мы зямельку там капалі.
Ён сваю, а я сваю,
Пра надвор'е размаўлялі,
Часам — трохі пра сям'ю...
Плётак чуў тады нямала,
Што вядзе да Грышы след,
І ў мяне штось прападала
Дык пры чым жа
тут сусед?!
...Мы дамкі пабудавалі.
Я й на іншае гатоў:
Дабрадзеі «падагналі»
Не маленькі стос прутоў.
Еду з горада на дачу,
Шмат што думаю зрабіць...
Прыязджаю — незадача:
Ля прутоў сусед стаіць...
Не дае, зладзюга, маху:
А па штучцы, пакрысе,
Арматурыну пад паху
І сабе ў падвал нясе...
Я знямеў, як часам неба:
Слоў — ніякіх не знайшоў!
Грыша буркнуў:
«А мне трэба!»
І дахаты — стрымгалоў.
...Вось такія часам «дзеі»:
Шмат чаго я перажыў!
А з прутоў тых
ад... зладзеяў
Краты Грыша парабіў.

Іван Астроўскі,
г. Мінск.

«ХЛОПЕЦ БЫЎ НЕ З ПУЖЛІВЫХ»?

Маё маленства (найсвятлейшыя ўспамены!) праходзіла ў невялікім беларускім мястэчку. Усе людзі там ведалі адзін аднаго і сябравалі-радніліся, усе жылі ў прыватных дамах ці хацінках.

Была такая і ў нас, нагаравалася... Бо першы мамін муж, ваенны лётчык, загінуў на фронце — пакінуў сіротамі траіх дзяцей. Яшчэ двое нарадзіліся потым, пасля вайны, і ўжо ў новым шлюбе.

Карацей — сям'я ў нас была вялікая, жылі досыць бедна, хоць тата і хадзіў у начальніках. Працаваў ён старшынёй пассавета, а таму час ад часу проста мусіў прымаць рознае начальства. Мама тады старалася нешта прыгатаваць, стол накрывала ў альтанцы, можна сказаць, за плотам, так што бачыць яго наша суседка цёткa Клава ну ніяк не магла, але ж нейкім неверагодным чынам «знюхвала» з'яўленне гасцей і заўжды прыходзіла. Любіла яна пасядзець, пагутарыць з важнымі людзьмі, паказаць сябе...

Неяк раз нават пачастунак перад сабою несла — яйкі ў маленькім рэшаце.

А тут, як на ліха, наш сабака пад ногі. Цётка вобзем, яйкі, што называецца, усмятку, мы, дзеці, у рогат — у той раз.

У наступны — звязаны з гэтай суседкай — мне ўжо не да смеху было.

...У школе і ў нашым класе вучыўся хлопчык Валера. Ён мне вельмі падабаўся, але ж выгляду я не падавала. Ён сам аднойчы прапанаваў сустрэцца. Я, вядома ж, згадзілася, прызначыла месца і час (пад вярбой каля дома цёткі Клавы, пасля ўрокаў), а вось прыйсці на тое спатканне ну ніяк не магла. Наша класная папрасіла застацца, падрыхтаваць выпуск насценгазеты.

Я тады да цёткі Клавы: маўляў, вечарам на лавачцы пад вашай вярбой будзе Валера. Дык вы, калі ласка, падыдзіце да яго, скажыце, што я спазнюся.

Суседка паабяцала, але ж, каб хлопец не спалохаўся і адразу не збег, узяла маю чырвоную кофтачку, загадзя накінула на плечы, села на лаўку — чакае...

А Валера (пра гэта я не хутка дазналася) быў не з пужлівых: прыбегшы на спатканне і ўбачыўшы «маю» спіну (голле вярбы звісала ледзь не да зямлі, так што бачыць гэтага ніхто не мог), адразу ж абняў «мяне», пачаў... цалаваць і толькі тады ўбачыў, каго...

Цётка Клава пра гэты пацалунак чамусьці прамаўчала. Ды і сам Валера «герой». Толькі гадоў праз дзесяць, на сустрэчы выпускнікоў, пры ўсіх расказаў пра сваё першае каханне. І пра першы пацалунак — таксама.

Я ж — і тады, у школе, і потым, аж да тога самага вечара — думала, што памылілася, што з боку Валеры не было да мяне аніякіх пачуццяў, што спатканне ён прызначыў проста так.

Альвіна Васільева,
г. Гомель.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

АД ЯЕ Ж напамін: усе «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі» на старонках «Звязды» не проста друкуюцца — удзельнічаюць у конкурсе на найлепшую. Вызначаюць іх, тыя найлепшыя, два журы — малое рэдакцыйнае і вялікае чытацкае, у склад якога рады прыняць кожнага ахвотнага.

Што для гэтага трэба? Па-першае, цягам года чытаць усе змешчаныя гісторыі (сайт «Звязды» ў дапамогу!), па-другое, нейкім чынам пазначаць тое, што спадабалася...

І ўсё для таго, каб блізкі да Каляд назваць сваю дзясятку найлепшых. Творы, якія набяруць максімальную колькасць галасоў, выйдуць у лідары — з усімі адсюль наступствамі ў выглядзе ганаровых дыпломаў і каштоўных прызоў. Так што чытайце, пішыце! *(Напрамілы бог — з нумарам тэлефона для аператыўнай зваротнай сувязі.)* І, вядома ж, выпісвайце — сваю, найстарэйшую, «родную газету на роднай мове»!

Неасабісты суб'ектыў

ШАЛЁНЫЯ ДАЧНІКІ

Дыягназ як гарантыя жыццяздольнасці

ЯГО, гэты дыягназ, я паставіла нядаўна сама сабе. Некалькі гадоў супраціўлялася, спадзявалася, што не накрыце, — не атрымалася, усе сімптомы ў наяўнасці. Сёння, напрыклад, з раніцы насілася па крамах насення, шукала спаржавую фасолю. Вы ведаеце, так і не знайшла таго насення — трэба ў абед на Камароўку exаць. Нейкая паскуда ў зямлі зжэрла ўсё, што было пасеяна ў маі, палова градy стаіць пустая. Не пакідаць жа на ўсё лета. Так што фасоля патрэбная да выхадных кроў з носу. І я знайду яе абавязкова, нават калі прыйдзецца аб'exаць увесь Мінск і прыгарад...

Хаця, каб спытаўся: навошта мне тая фасоля трэба? Кожны ж дзень яе не ясі, калі захочаш, дык вунь у любой краме круглы год у замарожаным выглядзе — роўненькая, зялёненькая. І недарагая — калі палічыць, колькі аддасі за пасеяць-пересеяць-падкарміць, дык тое на тое і выйдзе. Але навошта купляне, калі можна сваё? А зямля, што, гуляць будзе? Акурат гэтыя пытанні і ёсць першыя сімптомы хваробы «шалёны дачнік». І хвароба пачынае вельмі хутка прагрэсіраваць, калі пытанні падмацоўваюцца дзеяннямі.

Вось, напрыклад, вы думаеце, я з тых крам насення з пустымі рукамі выйшла? Як бы не так! Зараз прааналізавала змесціва торбы, якая ўжо пачала адцягваць плячо, і сама з сябе дзіўлюся: калі паспела ўсё гэта з паліц пахапаць? Карацей, у торбе ляжаць: пяць пачкаў рознай салаты (яшчэ ёсць, але хай будзе ў запас, падсеяць), бутэлька бярозавага дзёгцю (бабулі ў краме казалі, што калі ім вакол намазаць ствалы груш ці яблынь — не будзе тлі), цуда-атрута ад смаўжоў і слімакоў (вось я сёлета іх і пачастую, а то летась усе перцы пагрызлі), матычка, падобная на маленькі плужок (добра будзе памідоры ды капусту падсыпаць). Гэта, зазначу, купленае «з выпадку» — ішла ж я па фасолю! І то часу асабліва не было, інакш у торбу «з выпадку», але вельмі патрэбнае, проста не змясцілася б...

ПРА тое, што са мной нешта не так, я пачала здагадвацца, калі «завісла» на агародзе ў піжаме і хатнім халаце. Выйшла з раніцы па патрэбе на пару хвілін — і прапала. Ды так, што дамашнія ўжо захвалявaліся і паслалі дзяцей мяне шукаць. А я — што я: парнік адкрыла, паглядзела на памідорчыкі, ці падраслі за тыдзень. Я ж іх — кожнае каліва — у твар ведаю, сама сеяла, гадавала, перасаджвала. Пасля пайшла на агуркі паглядзела, на кабачкі, на гарбузікі, на бурачкі... Апошнія якраз з раніцы ў цяньку ад яблынь, ды пасля дажджу — так хораша і прыемна іх палоць... Карацей кажучы, за гэтым карысным заняткам (у халаце і піжаме) мяне і засталі пляменнікі, якіх ужо выправілі шукаць цётку Лену, якая прапала, не паснедаўшы, невядома куды. Вось тады я, глянуўшы на сябе ў люстэрка, і паставіла канчатковы дыягназ: шалёны дачнік.

ШАЛЁНАГА дачніка не варта блытаць са звычайнымі вясковымі гаспадарамі, хоць ён і стараецца пад іх мікрыраваць. У вясковага гаспадара работы на зямлі не менш, але ў яго ўсё размерана і больш-менш спакойна. У шалёнага дачніка (а гэту заразу падчэпліваюць тыя, хто жыве і, галоўнае, працуе ў горадзе) усё робіцца наскокам і за раз — на выхадныя. З адпаведнымі фізічнымі наступствамі — скручанай спінай, болем у каленях, руках і іншых частках цела. Мы нядаўна пра гэта з пастаянным экспертам «Звязды» доктарам Гуменам разважалі. Ён цалкам рэзонныя пытанні задаваў: ці вартыя тыя памідоры (якія яшчэ не факт, што не з'есць фітафтора, калі не згледзіш), каб класці на іх уласнае здароўе? Не разумееце вы, доктар, шалёных дачнікаў. Спіна пабаліць і пройдзе. А вось калі не дапалоць ці яшчэ што не дарабіць — вось тады і сапраўды захварэць можна ад перажыванняў! Бо, бывала, не спіцца ноччу, ляжыш і думаеш: вось паўзе па рэчцы туман, запаўзае праз шчыліны ў парнік... Я ж кажу — дыягназ.

У шалёных дачнікаў свая вельмі добразычлівая супольнасць. У крамах, на рынках, нават у тралейбусах і метро яны па нейкіх толькі ім вядомых прыкметах пазнаюць адно аднаго. Ну, вы ж таксама заўважалі, як абсалютна незнаёмыя паміж сабой людзі ўжо праз пару хвілін захоплена размаўляюць, дзеляцца сакрэтамі падкормкі агуркоў або спрачаюцца аб перавагах зялёнага мыла над гаспадарчым у барацьбе са шкоднікамі? Ну дык гэта дакладна яны! Непрымірымыя працаўнікамі шалёныя дачнікі становяцца толькі ў адным выпадку — у выхадны дзень у грамадскім прыгарадным транспарце. Тады пра ўсялякую салідарнасць усе забываюцца і клапоцяцца толькі пра тое, каб убіцца ў маршрутку або аўтобус і па магчымасці камфортна размясціць свой багаж — дубцы-саджанцы, рукзак, вядро... Спіс мяняецца ў залежнасці ад перыяду дачнага сезона...

ШТО характэрна, хвароба гэта, асабліва апошнім часам, надзвычай заразная і перадаецца шляхам назірання і перайманння вельмі хутка. І гэта, трэба заўважыць, зусім іншая яе разнавіднасць, чым тая, што была на пачатку 1990-х, калі шалёнымі дачнікамі парабіліся амаль усе гараджане — каб элементарна пракарміцца. Цяпер расклад іншы: побач з сядзібамі скрозь стаяць машыны, нярэдка дарагія, увечары амаль з кожнага двара даносіцца водар шашлыкоў... А ўсё роўна шалёныя дачнікі на гэтых самых падворках стаяць з раніцы пятай кропкай угору (здараецца, нават у піжаме) і полюць (перасаджваюць, сеюць) нешта, што без праблем і нават без асаблівага ўрону для бюджэту могуць купіць у любой краме.

Пра гэта мы нядаўна размаўлялі з суседкай, якая ні разу не вясковы чалавек. Дачу яны побач з намі купілі гадоў восем назад і спачатку толькі касілі на ўчастку траву. Зараз жа ў іх — і цяпліца, і перцы пад дугамі, і малады сад, і грады. А з гаспадыняй, якая працуе ў сталіцы перакладчыцай, мы стаялі і спачатку размаўлялі пра цуда-сродак — тэхнічны нашатырны спірт, які і крыніца азоту для раслін, і атрута для шкоднікаў... «Вось спытай: навошта мне ўсё гэта, — разважала яна. — Усё ж купіць можна... Я пра гэта думала і нядаўна зразумела: мне так надзейней. І дачцэ маёй надзейней. Нібыта я не гradкі пасадзіла, а сама ў гэту зямлю карані пусціла...»

А з каранямі ў зямлі хай паспрабуе хто цябе з яе зрушыць.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«Беларусь – это ЦІКАВА: июль. МТБанк»

1. Организатор Рекламной игры

Организатором Рекламной игры является общество с ограниченной ответственностью «Рефорте», УНП 100422707 (далее – Организатор) с местом нахождения по адресу: 220030, Беларусь, г. Минск, пл. Свободы, д. 4, офисное помещение № 334. Электронный адрес: post@forte.by.

2. Наименование и территория проведения Рекламной игры

Рекламная игра имеет наименование «Беларусь – это ЦІКАВА: июль. МТБанк» (далее – Игра) и проводится на территории автозаправочных станций предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в Государственное производственное объединение «Белоруснефть» (далее – ПО «Белоруснефть»), находящихся в Республике Беларусь.

3. Срок начала и окончания Игры

Игра проводится с 01 июля 2022 г. по 08 сентября 2022 г. (включая срок выдачи выигрыша и опубликования результатов проведения Игры).

4. Комиссия по проведению Игры

Для проведения Игры Организатор утверждает комиссию по проведению Игры (далее – Комиссия) в составе 5 человек, в том числе председателя Комиссии.

Состав Комиссии:

1. Даниленко Валерий Михайлович – Управляющий ООО «Рефорте», председатель комиссии;
2. Кузнецов Дмитрий Владимирович – индивидуальный предприниматель;
3. Кричковская Светлана Владимировна – главный бухгалтер ООО «Рефорте»;
4. Даниленко Ольга Михайловна – специалист по рекламе ООО «Рефорте Групп»;
5. Чефанова Маргарита Игоревна – бухгалтер ООО «Рефорте».

5. Наименование товаров/услуг, в целях стимулирования реализации которых проводится Игра

Игра проводится в целях стимулирования использования банковских платежных карточек международной платежной системы Mastercard (далее Карта Mastercard), эмитированных ЗАО «МТБанк» (Республика Беларусь), за исключением карт Maestro и Белкарт/Maestro, для оплаты за покупку топлива на автозаправочных станциях предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в ПО «Белоруснефть».

6. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится Участником Игры

6.1. К участию в Игре допускаются совершеннолетние (достигшие 18 лет) граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства.

6.2. Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства, члены Комиссии.

6.3. Для участия в Игре необходимо выполнить следующие условия:

